М. В. Альфер   А. П. Сафонава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА



5

Частка 2

**2.** Прачытайце. Пастаўце дзеясловы ў 3-й асобе адзіночнага ліку і вызначце спражэнне дзеясловаў.

Узор: *стаю — стаіць* (2).

крычу, размаўляю, лячу, гуляю, шапчу, злучаю, адшукваю, прыходжу, важу́

Запішыце. Складзіце два простыя сказы з дзеясловамі ў 3-й асобе (вусна).

С. п. **3.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Па рабоце майстра відаць.
**Белыя ручкі чужую працу любяць.**
Сон на заўтра адкладзі, а справу сёння зрабі.
Бяда хоць мучыць, але жыць вучыць.
Рыхтуй сані летам, а зімой калёсы.

Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў. Выдзелены сказ разбярыце па членах сказа.

**4.** Прачытайце верш. Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку.

У лесе вучыў я мову.
Назоўнікамі дрэвы ў ім шумяць.
Тут птушкі ўтвараюць дзеясловы —
Пяюць, шчабечуць, свішчуць і крычаць.
Зязюля раніцой лічэбнік вучыць —
Плыве наўсцяж стосотае «ку-ку».
Цвіце багун. Цвіце чабор гаючы.
Вісяць, што коскі, шышкі на суку. *Віктар Гардзей*

Як вы зразумелі сэнс верша? Падзяліцеся думкамі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

## 17

С. п. **1.** • Пры спісванні пастаўце перад дзеясловамі ***не***. Адкажыце, ці змяніўся сэнс выказванняў.

1. Вывучыш урокі — атрымаеш добрую адзнаку. 2. Будзеш займацца фізкультурай — будзеш здаровым і спрытным. 3. Будзеш чытаць кнігі — навучышся выказваць свае думкі.

Абазначце спражэнне дзеясловаў.

• Устаўце прапушчаныя літары, дапішыце патрэбныя дзеясловы і абазначце іх спражэнне.

1. Сонца свеціць і грэ.., а месяц толькі ... .
2. Капусту садз..ць, а ячмень ... .
3. Бульбу капа..ць, а канюшыну ... .
4. Яблыкі на зіму моч..ць, а агуркі ... .

Словы для выкарыстання: *соляць, косяць, свеціць, сеюць.*

• Прачытайце пачатак апавядання. Прыдумайце працяг. Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

Ідзе Васіль па лесе. Вецер калыша дрэвы. Раптам Васіль пачуў трэск. Ён азірнуўся...

**падбе́л, курасле́п, сон-трава́**

**2.** Разгледзьце малюнкі.









Правообладатель Издательский центр БГУ

Прачытайце тэкст. Замест дужак устаўце прапушчаныя назвы кветак.

Надышла вясна. На прыгрэтых мясцінах залатымі зорачкамі зацвіў (...). У лузе каля рэчкі падняў тонкія сцяблiны жоўты (...). А ў лесе на палянах раскрыла ліловыя махнатыя званочкі (...).

Чаму нельга рваць гэтыя кветкі? Раскажыце.

**3.** Прачытайце. Вызначце час дзеясловаў.

**Сакавік**

У палях яшчэ мяце завіруха. А пад снегам пачынаюць расці першыя кветкі — падснежнікі. Яны адчуваюць набліжэнне вясны. Чаму ж падснежнікі пачынаюць расці яшчэ зімой? Гэтыя кветкі вельмі любяць святло. А ў голым лесе святла многа. Лістоў жа яшчэ няма.

Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў цяперашняга часу.

---

**18**

**1.** Падрыхтуйцеся пісаць пад дыктоўку.

**Вясна прыйшла**

Вясна прыйшла раптоўна. З вечара мацаваўся востры марозік. Сонца нясмела і ленавата ўставала з-за лесу. А калі ўзнялося над лесам, усё змянілася. Шэрань знікла. Сонца расплюшчыла шырока вочы. І ўсё адразу заварушылася. Снег памякчэў, асунуўся. З узгоркаў пабеглі ручаіны. На рэчцы лёд пачаў адставаць ад берагоў. На схілах узгоркаў паказаліся



Правообладатель Издательский центр БГУ

чорныя плямы. Над імі падымалася белая па́ра. Здавалася, што зямля ўздыхае пасля доўгага зімовага сну.

*Паводле Петруся Броўкі*

Напішыце тэкст пад дыктоўку.

*Граматычныя заданні*

• Разбярыце сказы па членах сказа. 1-ы варыянт — першы сказ, 2-і варыянт — другі сказ.

• Да дзеяслова *ехаў* (1-ы варыянт), *ішоў* (2-і варыянт) падбярыце 3—5 аднакаранёвых дзеясловаў з рознымі прыстаўкамі і запішыце іх.

• Дзеясловы неазначальнай формы пастаўце ў 3-й асобе адзіночнага і множнага ліку. Вызначце спражэнне дзеясловаў:

маляваць, спаць, ісці, браць (1-ы варыянт);
класці, спяваць, пісаць, глядзець (2-і варыянт).

**2.** Прачытайце. Вызначце час дзеясловаў. У дзеясловах цяперашняга часу вызначце спражэнне.

Ляціць да нас на сонечных крылах вясна. Многа спраў у яе. Але не ўсё робіць вясна адразу. У яе парадак работы строгі. Спачатку вясна гоніць снег з зямлі. Робіць праталіну за праталінай. Потым на рэчках і азёрах лёд ломіць. І толькі пасля гэтага прыходзіць у лес з зялёным уборам і птушынымі песнямі.

**3.** Дапішыце апавяданне па яго пачатку. Дайце загаловак.

У школьнікаў пачаліся вясеннія канікулы. На тыдзень адкладзены падручнікі і сшыткі...



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Разгледзьце малюнкі.

## Паводка





Складзіце вусна апавяданне паводле малюнкаў, а потым запішыце яго.

**ле́дзьве**

**2.** Прачытайце выразы. Што яны абазначаюць? Замяніце кожны выраз дзеясловам. Вызначце яго спражэнне.

Працерці вочы — ... .
Блытацца пад нагамі — ... .
Зарубіць на носе — ... .
Кляваць носам — ... .

Складзіце з выразамі сказы і запішыце.

Праверце сябе: *прачнуцца, перашкаджаць, запомніць, драмаць.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 20

**1.** Прачытайце размову хлопчыкаў.

Пасварыліся на перапынку хлопчыкі. Адзін другога ледзьве не штурхнуў:

— Я табе пакажу, дзе ракі зімуюць!

А другі яму:

— Бач ты, як раскрычаўся! Глядзі, каб не давялося дзёру даць.

Тут падбег да хлопчыкаў дзяжурны і давай іх разнімаць. А тыя на яго накінуліся:

— Усё сочыш! Усё са скуры вон лезеш!

А дзяжурны раптам як крыкне:

— Стойце! Разгадайце свае загадкі.

— Якія такія загадкі? — здзівіліся хлопчыкі і расціснулі кулакі.

— А вось такія, — сказаў дзяжурны. — Слухайце! Што азначаюць выразы: *дзе ракі зімуюць, даць дзёру, са скуры вон лезці*?

А як вы растлумачыце гэтыя выразы?

Выпішыце дзеясловы і абазначце іх спражэнне.


Паводле тэксту падрыхтуйце сцэнку і разыграйце ў класе.

**2.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Апёкшыся малаком, і ваду студзіць будзеш.

Хоць бачыць вока, ды дастаць далёка.

Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Рашыце рэбусы-задачкі.

1. Зайка − з + Б / дзяцел − л + й / гара − ра + дуб − б + + е = … .

2. Дом − м + брыль − ль + я / слон − н + вы / дах − х + + лён − н + кара − ра / чуць − ць + вар − р + ць = … .

Запішыце адказы. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

## 21

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Правообладатель Издательский центр БГУ

Складзіце апавяданне. Прыдумайце назву.

Словы для даведкі: *пускаў караблікі, сядзеў побач, схапіў рукавіцу, пагнаўся за свавольнікам, не заўважыў, упаў.*

Змяніце дзеясловы па часах. Вызначце спражэнне дзеясловаў. Запішыце дзеясловы ў цяперашнім часе.

**2.** Запішыце апавяданне, складзенае па малюнках да папярэдняга практыкавання.

Ці здаралася з вамі нешта падобнае? Раскажыце.

---

**22**

**1.** Прачытайце. Памяняйце часткі месцамі так, каб атрымаўся тэкст. Змяніце займеннікі, як патрабуе сэнс. Запішыце.

**Абуджэнне зямлі**

1. Бягуць звонкія ручаі. Вада ў (*яны*) іскрыцца на сонцы.

2. Усё мяняецца навокал, прыгажэе. Гэта абуджаецца зямля.

3. Грэе сонца. Ад (*яно*) цёплых промняў усё ажывае.

4. Прыляцелі птушкі. (*Яны*) вясёлыя галасы разносяцца па ўсім лесе. Для (*яны*) вялікая радасць вярнуцца ў родныя мясціны.

5. Яшчэ нядаўна на палях ляжаў снег. Цяпер ад (*ён*) нічога не засталося.

Абазначце спражэнне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу.

Праверце сябе: часткі 3, 5, 1, 2, 4 складаюць тэкст.

**2.** Працягніце тэлефонную размову.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Прывітанне, ...!

— Дзень добры, ...!

— ..., выйдзі на вуліцу. Пойдзем назіраць, як шпакі засяляюцца ў свае домікі.

— ...

— ...

— ...

Раскажыце, што ўбачылі дзеці, назіраючы за шпакамі. Запішыце 3—4 сказы.

**3.** Разгледзьце малюнак.



 Якая размова можа адбыцца паміж дзецьмі? Разыграйце гэту сцэнку ў класе.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Закончыце сказы. Запішыце.





Шпак — агароднік, таму што ён ... .
Сініца — садоўніца, таму што яна ... .

Апішыце шпака. Запішыце тэкст-апісанне ў сшытку. На прагулцы палічыце, колькі шпакоўняў развешана ў школьным садзе і на агародзе. Зрабіце вывады. Падзяліцеся думкамі.



**5.** Разгледзьце малюнкі.







Адкажыце на пытанні.
Якіх насякомых — шкоднікаў саду і агарода вы ведаеце?
Якую шкоду насякомыя наносяць раслінам?
Хто ахоўвае расліны ад шкоднікаў?
Як трэба дапамагаць птушкам?
Запішыце адказы на пытанні.



Правообладатель Издательский центр БГУ

# ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ 1-га, 2-га СПРАЖЭННЯ

**1.** Прачытайце. Выдзеліце ў дзеясловах аснову і канчатак.

*я спяваю — мы спяваем*

**1-е спражэнне** *ты спяваеш — вы спяваеце*
*ён (яна, яно) спявае — яны спяваюць*
*я гавару — мы гаворым*
**2-е спражэнне** *ты гаворыш — вы гаворыце*
*ён (яна, яно) гаворыць — яны гавораць*

Як змяняюцца дзеясловы?
Чым адрозніваюцца тыпы спражэння дзеясловаў?

**2.** Праспрагайце вусна дзеясловы.

гадаваць, знішчаць, знаёміць, помніць

Складзіце тры сказы (апавядальны, пытальны, клічны) з гэтымі дзеясловамі.
Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

**упэ́ўненасць**

**3.** Прачытайце.

**Ці жартам, ці ўсур'ёз?**

* * *

— У мяне сёння страшэнна трашчыць галава.
— Чаму ж трэску не чуваць?



Правообладатель Издательский центр БГУ

* * *

— Што ты робіш?
— Ікс шукаю.
— Трэба ўсё класці на месца, тады не будзеш шукаць!

Чаму ўзнікла непаразуменне? Як вы разумееце выраз «трашчыць галава»?

Знайдзіце дзеясловы, вызначце спражэнне.

**4.** Падумайце і адкажыце на пытанне: «Што можна страціць?»

Праверце сябе: *рэч, грошы, давер, памяць, кроў, сілу, упэўненасць, прытомнасць.*

Утварыце словазлучэнні. З трыма-чатырма словазлучэннямі складзіце і запішыце сказы.

## 24

**1.** Праспрагайце па два дзеясловы 1-га і 2-га спражэння. Складзіце з імі чатыры-пяць сказаў. Запішыце.

**2.** Устаўце дзеясловы, супрацьлеглыя па сэнсе. На якія пытанні адказваюць дзеясловы цяперашняга часу?

| | |
|---|---|
| *узяць — аддаць* | вымачыць — ... |
| падняцца — ... | наліць — ... |
| адпачыць — ... | нагрэць — ... |
| бегчы — ... | святлець — ... |

**3.** Ад дзеясловаў неазначальнай формы ўтварыце дзеясловы цяперашняга часу 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

*хадзіць — хаджу, ходзім*
вадзіць — ...
вучыць — ...
насіць — ...
лячыць — ...
сушыць — ...
саліць — ...
круціць — ...

Запішыце два сказы з гэтымі дзеясловамі (на выбар). Абазначце іх спражэнне.

**4.** Да наступных назоўнікаў падбярыце аднакаранёвыя дзеясловы ў неазначальнай форме, а потым утварыце дзеясловы 3-й асобы адзіночнага ліку.

Узор: *загадка — загадаць — загадае.*

гаворка, сінява, прымерка, крык, думка, збор, адказ, фарба

Разбярыце назоўнікі па саставе. З дзеясловам (на выбар) складзіце тры сказы, запішыце і абазначце спражэнне дзеясловаў.

---

## 25

**1.** Прачытайце дыялог.

— Бабуля, сёння нам чыталі цікавы верш, толькі я не ўсё зразумела.
— Калі нешта не зразумела, мая галубка, трэба пытацца. Болей спытаеш — болей пазнаеш.
— Як дзядуля кажа, вучыцца — заўсёды згадзіцца.
— ...
— ...

Якія прыказкі ўжыты ў дыялогу? Прадоўжыце дыялог. Разыграйце яго ў класе.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Складзіце дыялог так, каб у ім можна было выкарыстаць прыказку «Новых сяброў набывай, але і старых не забывай».

**3.** Прадоўжыце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Аб тым зязюля кукуе, што свайго гнязда … .
Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна … .
Сярод ваўкоў жыць — па-воўчы … .
Добра таго вучыць, хто хоча … .

Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

Словы для даведкі: *выць, служыць, вучыцца, не мае.*

**4.** Прачытайце. Дзеясловы ў дужках ужывайце ў патрэбнай асабовай форме.

Даўгахвостыя дзятлы заўзята (*барабаніць*) па дрэвах. Адны з іх (*шукаць*) у кары на абед казюлек, другія (*будаваць*) жыллё. (*Збудаваць*) сабе хату дзяцел, (*глядзець*), а ўжо вавёрка ў ёй жыве. (*Пабедаваць*) дзяцел, ды што (*зрабіць*) з дужэйшым — не (*выганяць*). І зноў (*шукаць*) дупло на хвоі для новай хаты.

*Паводле Алеся Якімовіча*

Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

Вы ўбачылі, што плача дзяўчынка. Што вы скажаце ёй у такой сітуацыі? Разыграйце сцэнку ў класе.

## 26

**1.** Праспрагайце дзеясловы *ляжаць, мець.* Запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Дзеясловы 3-й асобы адзіночнага ліку пастаўце ў множным ліку. Вызначце канчаткі.

Узор: *ходзіць — ходзяць.*

лечыць, пілуе, служыць, носіць, косіць, варыць, смажыць

Да якога спражэння адносяцца гэтыя дзеясловы? Складзіце і запішыце два пытальныя сказы з дзеясловамі (на выбар).

С. п. **3.** Прачытайце верш. Устаўце прапушчаныя канчаткі дзеясловаў.

Любл.. я лес, адвечны бор,
Дзе ўзнос.. хвоі ўгору шапкі,
Дзе рассціла.. елі лапкі
І востры верх імкн.. у прастор.
І дуб-крапак, і куст малы
Ста.. у мудрым задуменні,
А сосны соч.. і струмен..
Густы, духмяны пах смалы.

*Якуб Колас*

Як вы разумееце выраз *узносяць хвоі ўгору шапкі*?
Запішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў.

**4.** Прачытайце. Выпішыце спачатку дзеясловы 1-га спражэння, а потым — 2-га.

спяваць, дрыжэць, слухаць, піць, плаваць, збіраць, вазіць, вучыць, стаць, ляжаць, насіць

**5.** Праспрагайце дзеясловы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

гаманіць, размаўляць, любіць, кахаць, гуляць, рагатаць

Запішыце. Складзіце сказы з дадзенымі дзеясловамі.

**27**

**1.** Складзіце і запішыце невялікае апавяданне «У грыбах».



Выкарыстайце словы: *устаць, збірацца, ісці, знаходзіць, шукаць, заўважаць, збіраць, вяртацца, радавацца, стамляцца, адпачываць.*

**2.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Як увойдзе ў дом, не выганіш калом, а пара прыходзіць — ён і сам сыходзіць.

Мяне б'юць, калоцяць, рэжуць, я ўсё цярплю і ўсім дабром плачу.

Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць.

Ляжыць — маўчыць, як памрэ, дык зараве.

Запішыце. Вызначце спражэнне дзеясловаў.

**28**

**1.** Прачытайце. Вызначце спражэнне дзеясловаў.

гутару, гавару, кажу, размаўляю, гляджу, паглядаю, пазіраю, разглядаю, дакучаю, даймаю, дапякаю, запрашаю, прашу, клічу, зазываю

Блізкія па значэнні словы запішыце групамі. Абазначце канчаткі дзеясловаў. З некалькімі дзеясловамі (на выбар) вусна складзіце тры-чатыры сказы.

**спякóта**

С. п. **2.** Прачытайце.

Калі іду ў ягады, на хвілінку спыняюся каля ляснога ручая. У спякотны дзень п'ю сцюдзёную крынічную вадзіцу, набіраю ў біклажку і крочу далей. З ягад вяртаюся — зноў каля крынічкі раблю кароткі прывал. **Праганяю** смагу, мыю рукі, асвяжаю твар. Потым **слухаю** няхітрую песеньку чачоткі ў **чаромхавым** кусце. Крыху адпачываю ў **цянёчку** і іду дадому.

*Паводле Рыгора Ігнаценкі*

Які гэта тэкст: апавяданне, апісанне ці разважанне? Чаму?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Спішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў і выдзеліце іх канчаткі.

Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

**3.** Прачытайце верш.

**Сонейка**

Рана-раненька ўстаю,
Ласку людзям раздаю.
Днём не сходжу з сінявы,
Ды працую, як і вы.
Як і вы, іду я спаць —
Зноў мне раненька ўставаць. *Мікола Сівец*

Запішыце верш па памяці. Выдзеліце канчаткі дзеясловаў і абазначце спражэнне. Падкрэсліце займеннікі.

**4.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе.



Ля дарогі — шарык белы.
Вецер дзьме, а шарык цэлы.
А як дзьмухнуць хлапчукі —
Пух ляціць ва ўсе бакі. *Васіль Жуковіч*

Спішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі. Што вы ведаеце пра дзьмухавец? Раскажыце.

**29**

**1.** Прачытайце.

Плыв.. па вадзе гняздо. У ім ста.. чомга. На спіне сядз.. яе малыя дзеці. Калі ўзнікн.. небяспека, чомга ныра.. ў ваду ра-



Правообладатель Издательский центр БГУ

зам з імі або ўзлята.. ў паветра. Птушаняты ніколі не пакіда.. сваю маці. *Паводле Віталя Вольскага*

Спішыце, дапісваючы канчаткі дзеясловаў. Абазначце лік, асобу і спражэнне дзеясловаў.

**2.** Прачытайце.

За домам, у якім жыв.. Вадзік, раскінуўся прыгожы стары парк. Праўда, аб тым, што ён стары, нагадва.. толькі таўшчэзныя ліпы. У маі ўсе дрэвы ў парку апранаюць зялёныя абновы, а векавыя ліпы пакалыхва.. сухім галлём. У дупле адной з іх жыв.. шпачыная сям'я. Вадзік часта гуля.. тут, слуха.. птушыныя песні. *Паводле Міхася Пазнякова*

Спішыце, дапісваючы канчаткі дзеясловаў. Абазначце іх спражэнне.

У апошнім сказе падкрэсліце галоўныя члены сказа. Разбярыце па саставе выдзеленыя словы.

**3.** Прачытайце. Са слоў і словазлучэнняў складзіце сказы так, каб атрымалася апавяданне.

## Дзяцел-ласун

дзяцел, карысная птушка, сядзіць на клёне, дзяўбе кару, шукае мошак, праб'е дзірачку, п'е кляновы сок, дзяўчынка вырашыла дапамагчы, паставіла салодкай вады, частуйся, не крыўдзі клён

Запішыце апавяданне. Абазначце спражэнне дзеясловаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце.

### Гняздзечка

**Птушка** звіла гняздзечка высока ў кустах. І вось у гняздзе ціўкаюць трое птушанят. Дзеці знімаюць гняздо на зямлю. Яны разглядаюць птушанят і **пакідаюць** гняздзечка пад кустамі.

Раніцай дзеці зноў прыходзяць да гнязда, а яно пустое. Шкада стала дзецям птушанят.

Спішыце. Абазначце спражэнне дзеясловаў. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

Куды падзеліся птушаняты? Паразважайце.

## 30

**1.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце апавяданне. Дайце яму загаловак.





Апавяданне запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1. Чорны, страшны,
па барознах ходзіць,
ворагаў зводзіць.
2. Не званочак, а звініць,
ног не мае, а бяжыць.
Як гарэза — скок ды скок:
ён — вясёлы ... .

*Мікола Чарняўскі*

Спішыце. Вызначце спражэнне дзеясловаў.

## 31

**1.** Якія з наступных дзеясловаў адносяцца да 1-га спражэння?

пісаць, вазіць, гаварыць, паслухаць, збегчы, рабіць

Запішыце дзеясловы 1-га спражэння.

**2.** Устаўце прапушчаныя літары. Вызначце спражэнне дзеясловаў.

каж..ш (2-я асоба, адз. л., ... спр.), піш..ць (3-я асоба, мн. л., ... спр.), воз..ць (3-я асоба, мн. л., ... спр.), глян..ш (2-я асоба, адз. л., ... спр.), бяр..ш (2-я асоба, адз. л., ... спр.), круц..ць (3-я асоба, мн. л., ... спр.), кос..ш (2-я асоба, адз. л., ... спр.)

Запішыце.

**3.** Запішыце сказы ў такім парадку, каб атрымалася апавяданне.



Правообладатель Издательский центр БГУ

### Дапамога птушкам

1. І птушкі прывыклі да дзяцей, не баяцца іх.
2. У парку расце высокая бяроза.
3. Кожную раніцу да кармушкі прыходзяць дзяўчынка з хлопчыкам.
4. Вузкая сцяжынка вядзе да яе.
5. Дзеці ніколі не забываюць пакарміць птушак.
6. На бярозе вісіць кармушка для птушак.
7. Яны прыносяць птушкам зярняты, хлебныя крошкі.

Падкрэсліце дзеясловы, абазначце іх спражэнне.

**4.** Якія з наступных дзеясловаў адносяцца да 1-га спражэння?

гуляць, ляцець, насіць, чытаць, расці, танцаваць

Запішыце іх.

Якія з наступных дзеясловаў адносяцца да 2-га спражэння?

думаць, бегаць, чысціць, пісаць, ляпіць, вучыць

Запішыце іх.

**32**

**1.** Прачытайце. Напішыце пераказ па плане.

### Крылатыя вартаўнікі

Яшчэ не ўзышло сонца, але ўжо развіднела. Ціха на вуліцы і ў хаце. Ты спіш. На маладыя лісточкі капусты, агуркоў, яблынь і сліў паўзуць чарвякі і вусені. Мільёны пражэрлівых мошак налятаюць на сцяблінкі жыта і пшаніцы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Не хвалюйся. Ужо абвешчана трывога. Над садам, над полем, над кожным дрэўцам кружацца ластаўкі, шпакі, стрыжы, дразды і гарыхвосткі.

Птушкі вартуюць ад шкоднікаў кожную сцяблінку, кожны лісток. Шануй і беражы крылатых сяброў. Не чапай іх гнёздаў. Не палохай птушанят.

*Прыкладны план*

1. Якія шкоднікі пагражаюць садам і агародам?
2. Хто дапамагае чалавеку знішчаць шкоднікаў?
3. Як трэба адносіцца да крылатых сяброў?

Памяняйцеся сшыткамі з сябрам па парце. Праверце напісанае. Выпраўце памылкі адзін у аднаго.

**2.** Разгледзьце малюнкі.





Складзіце па малюнках апавяданне. Запішыце некалькі сказаў.

Выкарыстайце словы і выразы: *закружылася чародка галубоў, наляцеў каршун, схапіў кіпцюрамі, на дапамогу спяшаліся вароны, закаркалі, спалохаўся, выпусціў галубку.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ці назіралі вы што-небудзь падобнае? Раскажыце. Выкажыце свае адносіны да птушак.

**33**

## ЗМЯНЕННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ ПРОШЛАГА ЧАСУ

**1.** Прачытайце. Пастаўце пытанні да дзеясловаў і вызначце іх лік і час.

### Прыход красавіка

Надышоў красавік. Уся прырода ажыла, пацягнулася да святла. Непаўторнай духмянасцю пупышак і першых веснавых кветак напоўнілася паветра.

З прыходам красавіка перамянілі сваё жыццё лясныя жыхары. Прачнуўся і вылез з глыбокай нары барсук. Выбраўся з бярлогі мядзведзь. Ажылі краты́ і землярыйкі.

Прыкметныя змены адбыліся і ў падводным царстве. Рыбы выйшлі з глыбокіх частак вадаёмаў, дзе правялі ўсю зіму.

*Паводле Вячаслава Стомы*

Выпішыце дзеясловы разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца.

**2.** Прачытайце верш.

- Спішыце. Падкрэсліце дзеясловы прошлага часу.

### Заблудзіўся зайка

На палянцы ў лесе
Зайка заблудзіўся:
Бегаў колькі ўлезе,
У траве куляўся.

А як сонца села
І наўкол сцямнела,
Зайка спахапіўся,
Што дамоў спазніўся.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Ад дзеясловаў неазначальнай формы ўтварыце дзеясловы прошлага часу. Запішыце.

Узор: *вучыць — вучыў.*

ляцець, гнуць, кіпець, плысці, гарэць, абараняць, везці, кіраваць, расці, секчы

• Дзеясловы, што ў дужках, пастаўце ў прошлым часе.

усё (*прыгажэць*), усё (*буяць, цвісці, радавацца*), матылькі (*пырхаць*), пчолы (*гудзець*), таполевы пух (*кружыцца*)

Складзіце сказы на адну тэму.

Які тэкст у вас атрымаўся (апавяданне, апісанне ці разважанне)? Тэкст запішыце.

**3.** Прачытайце. Устаўце дзеясловы, супрацьлеглыя па сэнсе.

*узяў — аддаў*
сказаў — ...
падняўся — ...
адпачыў — ...
бег — ...

вымачыў — ...
нагрэў — ...
святлеў — ...
весяліўся — ...
адкрыў — ...

Запішыце.

На якія пытанні адказваюць дзеясловы прошлага часу?

**4.** Ад назоўнікаў *сябар, вячэра, вучоба* ўтварыце дзеясловы прошлага часу. Складзіце з імі сказы. Запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце верш. Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў. Вызначце лік і час дзеясловаў.

З выраю далёкага
Птушкі прыляталі —
Гагаталі, ёкалі,
Шчоўкалі, свісталі.

Засялялі домікі,
Майстравалі гнёзды.
Слухалі садоўнікі
Іх **канцэрт узнёслы**.

*Ніл Гілевіч*

Выпішыце дзеясловы, змяніце іх па ўзоры.

Узор: *прыляталі — прылятаў, прылятала*.

Як вы разумееце значэнне выдзеленых слоў?

Дзеясловы прошлага часу змяняюцца па ліках: *прылятаў — прыляталі*. У адзіночным ліку дзеясловы прошлага часу змяняюцца па родах: *шпак прылятаў* (м. р.), *зязюля прылятала* (ж. р.), *птушаня прылятала* (н. р.).

**2.** Прачытайце. Пастаўце пытанні да дзеясловаў прошлага часу.

Сонейка пачало промнямі лічыць на стрэхах ледзяшы. Забулькалі пад снегам ручаі. На таполі замахаў крыламі чорны грак. Снег у полі пацямнеў і асеў. У лесе на дрэвах набухлі пупышкі. Весела зазвінела сінічка на голым веццы. Звонка загрукаў дзяцел па старой асіне. Зажмурыўся мішка ад сонца і зароў на ўвесь лес: «Вясна прыйшла!»

Выпішыце назоўнікі з дзеясловамі прошлага часу, абазначце лік дзеясловаў і род (у адзіночным ліку).



Правообладатель Издательский центр БГУ

Узор: *Грак замахаў (адз. л., м. р.).*
*Пупышкі набухлі (мн. л.).*

Большасць дзеясловаў прошлага часу мужчынскага роду маюць суфікс ***-ў***: *бра**ў**, дзьму**ў**, сява**ў**.*

Дзеясловы прошлага часу жаночага і ніякага роду ў адзіночным ліку, а таксама ў множным ліку маюць суфікс ***-л-***: *ста**я**ла, свяці**л**а, зайш**л**о, іш**л**і.*

**3.** Прачытайце пачатак казкі «Зайкава хатка». Утварыце ад дзеясловаў, што ў дужках, формы прошлага часу.

(*Жыць-быць*) у лесе лісічка і зайчык. (*Прыйсці*) восень. Холадна (*стаць*) у лесе. (*Надумаць*) яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка (*збудаваць*) сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык — з труску-пяску. (*Перазімаваць*) яны ў новых хатках.

(*Настаць*) вясна, (*прыгрэць*) сонца ... .





Прадоўжыце казку.

Запішыце пачатак казкі. Абазначце лік і род дзеясловаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце. Падбярыце патрэбныя дзеясловы прошлага часу.

1. **Дзяўчынка** ... сяброўцы цікавую кнігу. 2. Паляўнічы ... на снезе сляды зайца. 3. Каля плота ... гурбы снегу. 4. Вучні пятага класа ... у **паход** па родных мясцінах. 5. За вёскай ... густы лес. 6. З захаду ... цяжкія воблакі.

Запішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

## 35

**1.** Складзіце водгук на твор, які вы прачыталі.

*План*

1. Як называецца твор і хто яго аўтар?
2. Пра што расказваецца ў творы?
3. Ці спадабаўся вам твор і чаму?
4. Якія творы вы любіце чытаць?

Запішыце водгук у сшытку. Праверце сябе.

**2.** Прачытайце і завучыце.

Травень вырасціў траву,
Я траву кароўцы рву.

Запішыце па памяці.
Што такое *травень*?
Ці ёсць тут аднакаранёвыя словы? Разбярыце іх па саставе.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Складзіце дыялог «У кніжным магазіне». Па дыялогу разыграйце сцэнку ў класе.



**2.** Перастаўце словы так, каб атрымаліся сказы. Запішыце іх. Дайце загаловак тэксту.

на, з, прагулка, пайшлі, татам, Мікіта
верабейка, яны, на, убачылі, сцяжынцы
доўгая, кароценькі, яго, у, дзюба, хвосцік, а
яшчэ, не, верабейка, лятаць, умеў
Мікіта, яго, прынёс, злавіў, і, дамоў
сілы, падрастаў, набіраўся, верабейка, жыў
і, верабейка, час, некаторы, хлопчык, акно, выпусціў, адчыніў, праз



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Спішыце. Дзеясловы пастаўце ў прошлым часе. Вызначце род дзеясловаў.

шынель (*вісець*) у калідоры, гусь (*шчыпаць*) траву, мазоль (*пячы*), пыл (*падняцца*), трава (*расці*), струмень (*біць*) з-пад крана, таполя (*шумець*), медаль (*блішчэць*), світанне (*надыходзіць*), заява (*ляжаць*) на стале, заняткі (*пачынацца*), салата (*падавацца*) на стол

З атрыманымі словазлучэннямі складзіце некалькі сказаў. Два-тры сказы запішыце.

**4.** Пастаўце дзеясловы ў прошлым часе жаночага роду.

браць, узяць, ірваць, ткаць, спаць, ліць, плыць, віць, не быць, спяваць, казаць

Запішыце. Пастаўце націск. Вусна складзіце сказы з кожным дзеясловам.

## 37

**1.** Разгледзьце малюнак на с. 59.

Адкажыце на пытанні.

У якія фарбы прыбірае прыроду вясна?

Як выглядае вясной рэчка?

Чым займаюцца дзеці?

Як дзеці рыхтуюцца сустрэць першых пералётных птушак?

Па малюнку і пытаннях да яго падрыхтуйце апавяданне. Прыдумайце загаловак. Выкарыстайце словы і выразы з папярэдніх практыкаванняў пра вясну. Запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ



**2.** Падбярыце чатыры дзеясловы, пастаўце іх у прошлым часе. Змяніце дзеясловы па ліках і родах. Запішыце.

**38**

**1.** Прачытайце.

Растаў снег. Зацвіў падбел. Дзяўчынка так радавалася першай кветцы, так скакала і пляскала ў далоні, што сонейка выглянула з аблокаў. Убачыла яно смелую кветку, якая не спалохалася холаду, і яму стала сорамна за сваю ляноту. Сонейка сагрэла зямлю. І тады пабеглі звонкія ручаі. Пачалася вясна.

А за вясною, як звычайна, прыйшло лета.

*Паводле Уладзіміра Арлова*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Выпішыце назоўнікі з дзеясловамі прошлага часу, абазначце лік дзеясловаў і род (у адзіночным ліку).

**2.** Прачытайце тэкст па асобах.

Запішыце. Абазначце час дзеясловаў.

### Дзве сястрычкі

Паспрачаліся аднойчы дзве сястрычкі:

— Я падам дзеду вады.

— Не, я падам дзеду вады.

— Не, я...

— Не, я...

Паспрачаліся дзве сястрычкі, а дзядуля застаўся без вады.

*Арнольд Дыбча*

**3.** З дзеясловамі складзіце сказы, аб’яднайце іх адной тэмай. Запішыце.

захварэць, наведаць, расказаць, дапамагчы, падрыхтаваць, зварыць

**4.** Прачытайце верш. Прыдумайце да яго загаловак.

Калі ранак настае —
Гора ў Фядота:
— Хто надзеў штаны мае?
Куды збеглі боты?
Пераверне ўсё ўверх дном,
Бегае, злуецца:
— Тут, на стуле, за сталом,
Я іх клаў, здаецца.

*Іван Муравейка*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Чаму злуецца Фядот?

Запішыце верш. Абазначце час дзеясловаў. Абазначце спражэнне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу.

**39**

**1.** Прачытайце верш.

**Два полі**

Было ў салдата два полі:
Поле, дзе кветкі ірваў,
Бегаў з сябрамі на волі,
І поле, дзе ён ваяваў.
Ціха было і чыста
Ў полі яго дзяцінства,
Былі агонь і дым
На полі ратным тым.

Два полі былі ў салдата:
Адно зелянела травой,
Другое было ўзарата
Вайной і паліта крывёй.
Было ў салдата два полі:
Поле, дзе кветкі збіраў,
Бегаў з сябрамі па волі,
І поле, дзе ён паміраў.

*Анатоль Вярцінскі*

Якім настроем прасякнуты твор?

Пра якія два салдацкія полі вядзецца размова ў вершы?

Ці ёсць сярод вашых родных і блізкіх удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны? Раскажыце пра іх сябрам.

Выпішыце дзеясловы прошлага часу, абазначце іх лік і род.

**2.** З дадзеных слоў складзіце сказы. Змяніце словы так, як патрабуе сэнс.

народ, беларускі, перамагчы, фашысты
у, баі, з, вораг, воіны, і, загінуць, партызаны, многія
Радзіма, подзвігі, іх, не, забыць
народ, паставіць, воіны, і, партызаны, помнікі



Правообладатель Издательский центр БГУ




адзін, з, такіх, стаіць, Мінск, у
перад, ён, агонь, Вечны, гарэць

Тэкст запішыце. Дайце яму загаловак.
Ці ёсць у вашай мясцовасці помнік героям вайны? Раскажыце.

**3.** Прачытайце верш.

Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс.
Начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпаных кроплямі рос.

*Пятрусь Броўка*

Запішыце. Вызначце спражэнне дзеясловаў.


Правообладатель Издательский центр БГУ

## 40

**1.** Прачытайце.

— Каго любіш?
— Люблю Беларусь!
— То ўзаемна...

Гэтыя словы гучалі паролем для паўстанцаў Кастуся Каліноўскага... Чаго дабіваліся паўстанцы? Адказ — у тым жа паролі. Любілі Беларусь і хацелі, каб яна была вольнай, каб яе працоўны люд жыў шчасліва. Каліноўскі загінуў за праўду для дабра твайго.

*Паводле Міколы Маляўкі*

Запішыце. Абазначце час, лік і род дзеясловаў прошлага часу.

**паро́ль**

**2.** Прачытайце.

мяне, праз, вядзе, вузкая, жытнёвая, сцяжынка, поле
шапоча, збажына, ціха
утрымліваюць, з, каласы, буйныя, вусатыя, сцяблінкі, цяжкасцю
промні, іх, сонца, яркія, песцяць
толькі, вецер, хлебную, ціхавейны, ніву, варушыць, зрэдку

Складзіце сказы. Запішыце іх. Ці ўтвараюць яны тэкст? Абазначце спражэнне дзеясловаў.

**3.** Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Растлумачце іх сэнс. Дапоўніце канчаткі дзеясловаў.

Раней устан.. — болей зроб.. . На гадзіну адстан.. — за дзень не дагон.. . Добра ўзар.. — ураджай збяр.. . Прачыта.. —



Правообладатель Издательский центр БГУ

іншым раскаж.. . Кашу маслам не сапсу.. . Рэшатам вады не прыняс.. . Што пасе.., тое і пажн.. .

Запішыце. Вызначце асобу і лік дзеясловаў.

**4.** Прачытайце. Дапоўніце канчаткі дзеясловаў.

1. Белыя бярозы пад сінявой начной ста.. . 2. Ідз.., цяч.. ў хлапцоў размова. 3. У садку шчабеч.. птушкі. 4. Нізка над вадой лята.. ластаўкі. 5. Мы веды набудз.. у школе, а веды — надзейны наш друг.

Запішыце. Абазначце асобу і спражэнне дзеясловаў.

## 41

**1.** Прачытайце. Напішыце пераказ па плане.

### Хатынь

22 сакавіка 1943 года фашысцкія карнікі спалілі вёску Хатынь разам з яе жыхарамі.





Правообладатель Издательский центр БГУ

Зараз Хатынь стала помнікам ахвярам фашызму на беларускай зямлі. З усіх спаленых беларускіх сёл сюды прывезена зямля, якая захоўваецца на сімвалічных могілках гэтых вёсак. Сцяна памяці расказвае пра сотні тысяч людзей, што загінулі ў фашысцкіх лагерах смерці.

Журботна гудуць званы Хатыні, каб людзі памяталі пра вялікія ахвяры, былі пільныя і ніколі не дапускалі вайны.

*Васіль Протчанка, Яўген Лаўрэль*

*Прыкладны план*

1. Злачынства фашысцкіх карнікаў.
2. Хатынь сёння.
3. Сцяна памяці.

А вы былі ў Хатыні? Раскажыце.

**2.** Падбярыце па два словы, якія б адпавядалі прыведзеным схемам.



1. Што такое дзеяслоў?
2. Што такое неазначальная форма дзеяслова?
3. Як змяняюцца дзеясловы цяперашняга і будучага часу?
4. Якія канчаткі маюць дзеясловы 1-га спражэння? 2-га спражэння?
5. Як змяняюцца дзеясловы прошлага часу?
6. Як пішацца ***не*** з дзеясловамі?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**42**

# ПРЫСЛОЎЕ

**1.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Вызначце сувязь выдзеленых слоў з дзеясловамі па пытаннях.

**Добра** працуеш — павагу маеш.
**Рана** ўстанеш — **многа** зробіш.
Калі **добра** ўзарэш, то і ўраджай збярэш.

Выпішыце словазлучэнні, пастаўце пытанні да выдзеленых слоў.

Ці змяняюцца гэтыя словы? Што яны абазначаюць?

У беларускай мове ёсць словы, якія абазначаюць прымету дзеяння ці якасці: *працуюць* (як?) ***дружна***, *прыгожы* (у якой меры?) ***вельмі***. Гэта **прыслоўі**. Яны адказваюць на пытанні ***як? у якой меры? калі? дзе? куды? адкуль?***

Прыслоўі не скланяюцца і не спрагаюцца.

**2.** Прачытайце. Вызначце сувязь прыслоўяў з дзеясловамі па пытаннях. Выпішыце словазлучэнні з прыслоўямі.

1. Надакучыла спрачацца, узяліся зноў за працу. (*Іван Мураўейка*) 2. Я за працаю спяваю ціхенька, як мама. 3. За гадзіну паспяваю я зрабіць нямала. (*Васіль Жуковіч*) 4. З братам Янкам да сняданку мы пілуем дровы ўранку. (*Алесь Марціновіч*)

Якую ролю ў сказе выконваюць прыслоўі?

С. п. **3.** Спішыце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Устаўце замест кропак патрэбныя па сэнсе прыслоўі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Хто язык доўгі мае, таму ... бывае.
Добраму чалавеку ... добра.
Блізка відаць, ды ... ды́баць.
Высока ляцеў, ды ... сеў.

Словы для даведкі: *усюды, дрэнна, нізка, далёка*.

**4.** Складзіце і запішыце сказы з прыслоўямі.

шумна, цесна, добра, блізка

---

**43**

**1.** Падбярыце да прыслоўяў супрацьлеглыя па сэнсе словы. Складзіце сказы з адной з гэтых пар. Запішыце.

Узор: *сумна — весела*.

добра, нізка, ціха, мала, позна, цяжка, часта, шырока, дорага, моцна, цёпла, прыгожа

**2.** Ад назоўнікаў утварыце аднакаранёвыя прыслоўі, дзеясловы і прыметнікі. Запішыце.

Узор: *смак — смачна, смакаваць, смачны*.

вяселле, радасць, моц, прыгажосць, стараннасць

**наво́ддаль, наво́дшыбе, неспадзява́на**

**3.** Прачытайце. Назавіце блізкія па сэнсе прыслоўі. Запішыце групамі.

крыху, наводдаль, нядрэнна, заўжды, горка, нечакана, крышку, далёка, трохі, заўсёды, крыўдна, балюча, раптам,


Правообладатель Издательский центр БГУ

удала, наводшыбе, злёгку, добра, выдатна, вечна, неспадзявана

Складзіце з некалькімі прыслоўямі (на выбар) сказы і запішыце.

**удзе́нь** **уначы́**
**уве́чары** **сёлета**
**ле́тась** **уле́тку**

**4.** Складзіце і запішыце сказы з прыслоўямі.

далёка, здалёку, нізка, уніз

Падбярыце да прыслоўяў супрацьлеглыя па сэнсе словы.

## 44

**1.** Прачытайце сказы.

1. Люстраное возера сінела направа. 2. Жыта красуе ўлетку. 3. Хмары плылі нізка над зямлёй. 4. Так у гутарцы непрыкметна прайшла дарога. 5. Ганна ўвайшла неспадзявана, без стуку. 6. Крышку стала прыгажэй на свеце: хлопчык пасадзіў дрэўца.

Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

**2.** Прачытайце сказы.

1. Песня палілася (...) **весела** і **звонка**. 2. Лугі квітнеюць (...) **там**, дзе былі балоты. 3. У калектыве работа ідзе (...) **спрытна**. 4. Сонейка пазірала на дзяцей (...) **цёпла**, **лагодна**. 5. (...) **Заўжды** жыве ў нашых сэрцах любы наш край.

Запішыце. Пры спісванні замест кропак пастаўце пытанні ад дзеясловаў да выдзеленых прыслоўяў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Раскажыце пра свой класны пакой.

Словы для даведак: *светла і ўтульна, справа, злева, побач, акуратна, уверсе.*

Запішыце.

**здалёку, зрэ́дку, зблі́зку**

**4.** Падбярыце да дзеясловаў прыслоўі, а да назоўнікаў — прыметнікі.

Сустракаць, сустрэча (радасная, радасна).
Маляваць, малюнак (прыгожа, прыгожы).
Спяваць, песня (звонкая, звонка).
Гуляць, гульня (цікава, цікавая).
Вучыць, вучоба (старанна, старанная).
Жыць, жыццё (шчаслівае, шчасліва).
Працаваць, праца (дружна, дружная).

Запішыце ўтвораныя словазлучэнні.

Узор: *Вучыцца старанна. Вучоба старанная.*

Складзіце з імі некалькі сказаў.

---

**45**

**1.** Да прыслоўяў падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем.

Ідзе павольна — бяжыць ... .
Спачатку папрацаваць — ... адпачыць.
Легчы позна — устаць ... .
Пачуць здалёку — убачыць ... .
Выйсці наперад — адступіць ... .

Запішыце.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** З дужак выберыце патрэбнае слова. Растлумачце свой выбар. Паразважайце.

Бацька старэйшы за свайго сына (*часта, заўсёды, рэдка, ніколі*).

**3.** Раскажыце, чым вы заўтра будзеце займацца.

Словы для даведкі: *раніцай, удзень, увечары, спачатку, потым*.

Запішыце свой расказ.

**4.** Падбярыце да наступных дзеясловаў патрэбныя прыслоўі, запішыце словазлучэнні.

ісці (як?) ..., бегчы (як?) ..., азірнуцца (куды?) ..., вярнуцца (калі?) ..., гаварыць (як?) ..., устаць (калі?) ..., ускрыкнуць (як?) ..., узняцца (куды?) ...

Запішыце словазлучэнні. Памяняйцеся сшыткамі з таварышам па парце. Праверце работу адзін у аднаго.

**5.** Прачытайце прыслоўі. Да кожнага з іх пастаўце пытанні. Складзіце з прыслоўямі сказы на тэму «У лесе». Запішыце.

аднойчы, густа, вакол, раптам, побач, хутка, насустрач

## 46

**1.** Прачытайце верш. Завучыце на памяць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Грае вечар на цымбалах,
Плаўна музыка гучыць.

А ў цёмна-блакітных далях
Ярка зорачка гарыць.

*Уладзімір Карызна*

Запішыце верш па памяці.
Падкрэсліце прыслоўі.

**2.** Прачытайце. Размясціце сказы так, каб атрымалася апавяданне. Дайце яму загаловак.

1. А жаваранак возьме ды выпырхне з-пад ног, паднімецца ў неба і зноў звініць.
2. Любіць Каця сустракаць веснавую раніцу.
3. Потым гэтак жа роўна апускаецца на зямлю.
4. З заміраннем сэрца слухае яна песню жаваранка.
5. Каця падкрадаецца да таго месца, куды ён садзіцца, і шукае гняздо.
6. Вось ён нерухома вісіць у паветры.
7. Неўзабаве песня трактара заглушае голас птушкі.
8. Вось і вясна прыйшла.
9. Заўтра зноў сустрэча з жаваранкам.

Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

С. п. **3.** Прачытайце. Памяняйце абзацы месцамі так, каб атрымаўся тэкст. Дайце яму загаловак.

Валерка і Сяргейка ішлі ўзмежкам паўз бульбяны палетак. Увішна працаваў трактар. Ён абганяў бульбу.

Тым часам трактар набліжаўся да ўзмежка. Валерка і Сяргейка спынілі машыну і расказалі трактарысту пра жаваран-



Правообладатель Издательский центр БГУ

каў. Той саскочыў на зямлю і падышоў да гнязда. Птушаняты даверліва разяўлялі жоўтыя дзюбкі.

Неўзабаве хлопчыкі спыніліся перад гняздом жаваранкаў. Там ляжалі птушаняты. Ім пагражала небяспека, бо пры развароце трактарыст мог наехаць на гняздо.

Хлопчыкі збегалі да кустоў алешніку, наламалі галінак і паўтыкалі вакол гнязда. *Паводле Міколы Корзуна*

Выпішыце прыслоўі разам з дзеясловамі, да якіх яны адносяцца.

**4.** Прачытайце. Устаўце словы, якія падыходзяць па сэнсе. Растлумачце, чаму так гавораць.

1. Добры чалавек ... робіць.
2. Ветлівыя людзі ... размаўляюць.
3. Большаму ... дастаецца.
4. Пра добрага чалавека ... і пагаварыць.

Запішыце. У аднакаранёвых словах абазначце корань. Да якой часціны мовы адносяцца аднакаранёвыя словы?

**47**

## ВУЧЫМСЯ ПІСАЦЬ САЧЫНЕННЕ НА ТЭМУ «ШКОЛА»

**1.** Прачытайце пачатак сачынення і разгледзьце малюнак.

З таго часу прайшло амаль чатыры (*пяць*) гады (*гадоў*). Здаецца, зусім нядаўна гэта было. Мяне прывялі (*прывезлі*) у школу (*школу-інтэрнат*). Усё і ўсе былі чужыя тут. Помню, колькі было слёз... Але побач ... .



Правообладатель Издательский центр БГУ



**2.** Пазнаёмцеся з прыкладным планам.

Пяць гадоў таму.
Побач добрыя дарослыя.
Школа — другі мой дом.
Прыпамінаю адзін выпадак.
Развітанне.

**3.** Выкарыстайце словы, выразы і вершаваныя радкі.

*тут я сустрэў, усе як родныя, сагрэлі любоўю, пяшчотай, вялікая, светлая, прыгожая, дапамагаюць, хутка час развітання, усплываюць у памяці, тут мяне навучылі*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Матуля-школа. Слаўны, мілы кут,
Маленства я сваё згадаю тут.
У гэты дом, у ціхі, мілы клас,
Напэўна, я зайду яшчэ не раз.
І школе роднай пакланюся я
За ўсё, чым для мяне яна была.

*Кастусь Кірэенка*

**4.** Паразважайце над загалоўкам сачынення: *Матуля-школа. Родная школа.*

Выберыце або прыдумайце свой загаловак.

**5.** Прадумайце змест сачынення. Запішыце яго ў сшытак. Праверце сябе.

**6.** Складзіце сказы з наступнымі словазлучэннямі.

злева ад дарогі, далёка да лесу, аднойчы пад вечар, побач з намі

Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

## 48

**1.** Прачытайце. Назавіце складаныя сказы.

1. У дарогу мы выбраліся позна калі замігцелі зоры. 2. Скончылася лета зноў ажылі школьныя класы. 3. Дзверы пакоя адчыніліся і парог нясмела пераступіў хлопчык. 4. Ціха сасонка шумела ледзь варушыла галлём. 5. Магутна велічна і ўрачыста гучала партызанская песня над лясной палянай.

Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі. Падкрэсліце прыслоўі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

навы́перадкі

С. п. **2.** • Прачытайце народныя прыкметы. Спішыце і падкрэсліце прыслоўі.

Вясёлка раніцай — на дождж, а вечарам — на добрае надвор'е. Пчолы лётаюць паблізу вулля — перад дажджом, а залятаюць далёка ў поле — перад добрым надвор'ем.

• Ад назоўнікаў утварыце аднакаранёвыя прыметнікі, дзеясловы і прыслоўі.

дабрыня, цяпло, цішыня, крыўда, дружба

З груп аднакаранёвых слоў складзіце сказы і запішыце іх.

• Прачытайце прыслоўі. Складзіце з імі сказы на тэму «Лета». Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

хутка, нарэшце, летам, прывольна, весела, навыперадкі

**3.** Прачытайце.

Лебедзь па сваёй грацыёзнасці, сіле, прыгажосці і велічнай паставе даўно справядліва названы «царом вадзянога птаства».

Перабудуйце гэта выказванне ў разважанне. Пачніце так: *Лебедзя даўно і справядліва называюць «царом вадзянога птаства», таму што...*

Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

**4.** Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Дэльфін**



1. Дзеля іх ён гатовы быў вырабляць усялякія выкрутасы.

2. **Маладога** дэльфіна людзі звалі Гогам.

3. А яшчэ Гога любіў танцаваць пад музыку, якая даносілася з берага.

4. Гога любіў дзяцей.

5. Ён быў **вясёлым**, цікаўным і **смелым**.

*Паводле Алеся Крыгі*

Запішыце. Выдзеленыя словы разбярыце па саставе.

**49**

**1.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні.

Сёння аўторак. Заўтра ў Мішы дзень нараджэння. На які дзень Міша запросіць гасцей?

У панядзелак Света сказала, што ўчора хадзіла з братам у кіно. У які дзень Света і брат былі ў кіно?

Назавіце прыслоўі.

**2.** Ці ўважлівыя вы?

**Тут нешта не так**

Хлопчык расказаў мне гісторыю:

— Іду я ўчора па дарозе, сонца свеціць, цёмна вакол. Лісточкі сінія пад нагамі шапацяць. І раптам з-пад плота выскачыў сабака, зароў: «Ку-ка-рэ-ку!» І рогі ўжо наставіў. Я спужаўся і збег. А ці не спужаліся б вы?

Што ў гэтай гісторыі няпраўда?

Назавіце прыслоўі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

## Коля Гойшык

Чэрвеньскаю раніцаю 1941 года пачалася вайна палалі вёскі гарэла жыта ў полі па пыльных дарогах ішлі на ўсход бежанцы прыйшлі ворагі і ў вёску дзе жыў Коля Гойшык яны расстралялі Колевага бацьку сам Коля пайшоў у партызаны са сваімі сябрамі Коля хадзіў на заданні пад адхон ляцелі фашысцкія цягнікі з танкамі і снарадамі салдатамі і афіцэрамі аднойчы Коля не вярнуўся з задання ён загінуў але памяць аб ім жыве.

Падзяліце тэкст на часткі. Запішыце тэкст па частках. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**4.** Складзіце сказы з прыслоўямі на тэму «Памяць аб вайне».

Словы для даведкі: *мужна, смела, вечна, шчасліва*.

Запішыце.

**50**

**1.** Прачытайце тэкст.

## Усяслаў Чарадзей

Князь Усяслаў Брачыслававіч правіў у Полацку. І не было ў адзінаццатым стагоддзі князя, мацнейшага за яго. Разляталіся чуткі, што князь — чараўнік, што апякуюцца над ім старадаўнія багі Мокаш, Пярун, Лёля, Вялес.

Мацаваў Усяслаў горад, а з ім і ўсю Полацкую зямлю. Пабудаваў новы вялікі замак, абнёс яго высокай драўлянай сцяной ды глыбокімі равамі. У самім жа замку белакаменнае дзіва



Правообладатель Издательский центр БГУ

паўстала — царква ў імя Святой Сафіі, альбо Мудрасці Божай. Будавалі яе палачане разам з візантыйскімі дойлідамі.

Не раз ворагі з поўначы і поўдня навальваліся на Полацкую дзяржаву. Вымаў тады Усяслаў меч свайго прадзеда Рагвалода.

Пры жыцці Усяслава першая беларуская дзяржава дасягнула найвышэйшай велічы, уславілася паміж іншымі дзяржавамі. Нам пакінуў Усяслаў у спадчыну любоў да Бацькаўшчыны і волі.

*Паводле Кастуся Тарасава*

Адкажыце на пытанні.
Дзе правіў князь Усяслаў?
За што яго празвалі Чарадзеем?
Які храм пабудаваў князь у Полацку?
Якой стала Полацкая дзяржава пры князю Усяславе?
Які запавет пакінуў нам Усяслаў Чарадзей?
Напішыце пераказ.

*Прыкладны план*

1. Легендарны князь.
2. Царква ў імя Святой Сафіі.
3. Найвышэйшая веліч беларускай дзяржавы.

Словы для даведкі: *Усяслаў Брачыслававіч, Рагвалод, Мокаш, Пярун, Лёля, Вялес, белакаменнае дзіва, візантыйскія дойліды, найвышэйшая веліч, любоў да Бацькаўшчыны і волі.*

**2.** Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра Рагвалода — прадзеда Усяслава. Выкарыстайце матэрыял з падручніка «Мая Радзіма — Беларусь».



Правообладатель Издательский центр БГУ

**51**

**1.** Прачытайце.

(*У*)ранні і (*у*)вечары, ноччу і (*у*)дзень,
(*Па*)небе, (*па*)сушы, (*па*)сіняй вадзе,
Пагодлівым летам і скрозь каламуць
(*За*)месяцам месяц няспынна ідуць:
Дванаццаць асілкаў, дванаццаць братоў —
Ніхто іх (*не*)чуе, (*не*)бачыць ніхто.

Як вы адрозніце прыслоўі ад назоўнікаў з прыназоўнікамі? Раскрыйце дужкі, запішыце. Прыслоўі падкрэсліце.

**2.** Прачытайце. Назавіце спачатку прыслоўі, а потым — назоўнікі з прыназоўнікамі. Складзіце з імі сказы.

радасна — з радасцю, цяжка — з цяжкасцю, паспяхова — з поспехам

Запішыце.

**3.** Складзіце сказы так, каб адно і тое ж слова ў адным выпадку з'яўлялася прыслоўем, а ў другім — назоўнікам.

справа, на памяць, дома

Сказы запішыце. Прыслоўі падкрэсліце.

**52**

**1.** Прачытайце. У якіх словазлучэннях ёсць прыслоўі?

хутка выканаць работу, хадзіць доўга, зняць са стала партфель, гуляць каля школы, добра выканаць заданне

Запішыце словазлучэнні з прыслоўямі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**натхнёны, наўздагóн, пóзні**

**2.** Прачытайце. Якія з наступных слоў — прыслоўі?

шумна, зверху, нізка, хутка, высокі, моцны, натхнёны, наўздагон, позні

Запішыце прыслоўі.

**3.** Прачытайце.

1. Хлопчык звярнуў (*на*)лева. 2. (*У*)дзень ліў моцны дождж. 3. Жыта красуе (*у*)летку. 4. (*З*)рэдку на небе ўспыхвалі зарніцы. 5. (*З*)ранку ад'язджаю я (*да*)дому. 6. Толькі (*з*)блізку можна было ўбачыць птушынае гняздо. 7. (*Не*)спадзявана ў вёску прыехалі артысты.

Спішыце сказы, раскрыйце дужкі. Разбярыце сказы па членах сказа.

**4.** Прачытайце радкі з верша. Спішыце без памылак. Знайдзіце прыслоўі і падкрэсліце іх (_ _ _), пастаўце да іх пытанні.

Можа, зблізку
Ці здалёку
Прыляцеў у госці Клёка.
У чырвоных чыстых ботах
Ходзіць важна па балотах...

*Алесь Прохараў*

**53**

**1.** Прачытайце словы, якія запісаны па-руску. Перакладзіце іх на беларускую мову.


Правообладатель Издательский центр БГУ

медленно, рядом, вдруг, тихо, впереди, сзади

Якія з гэтых прыслоўяў абазначаюць спосаб дзеяння? Запішыце іх.

**напрасткí, напрадвéсні**

**2.** Прачытайце.

унізе, наперадзе, моцна, напрасткі, заўтра, воддаль

Якія з гэтых прыслоўяў абазначаюць месца дзеяння? Запішыце іх. Вусна складзіце з імі сказы.

**3.** Прачытайце.

позна — рана, блізка — побач, крыху — трохі, весела — сумна, зімой — восенню, высока — нізка

У якіх парах слоў прыслоўі з'яўляюцца антонімамі? Запішыце.

**4.** Прачытайце.

засвяціла (у)дзень, (у)святочны дзень;
прыехаць (да)дому, расла (каля)дома;
прыйшоў (з)далёку, раскінуў (у)сюды;
здарылася (у)начы, (у)зімнюю ноч;
звярнулі (у)бок, (у)правы бок.

Раскрыйце дужкі, растлумачце правапіс. Запішыце. Выдзеліце прыстаўкі ў прыслоўях.

**5.** Прачытайце загадку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

З чалавекам ён сябруе,
Ноччу двор яго вартуе.
Служыць шчыра небарака,
Хоць і кажуць: «Злы ...».

*Нічыпар Парукаў*

Спішыце загадку без памылак. Знайдзіце прыслоўі і падкрэсліце іх (_ _ _), пастаўце да іх пытанні. Дапішыце адгадку.

**54**

**1.** Прачытайце.

сёння, напрадвесні, добра, заўсёды, учора, знізу

Якія з гэтых прыслоўяў абазначаюць час дзеяння? Запішыце.

**2.** Прачытайце. Ад назоўнікаў утварыце прыслоўі. Запішыце.

*радасць — радасна*

| | |
|---|---|
| цішыня — ... | горыч — ... |
| цяжкасць — ... | крыўда — ... |
| шырыня — ... | гора — ... |

З двума словамі (на выбар) складзіце сказы і запішыце.

**3.** Прачытайце словы. Складзіце з імі сказы на тэму «На рэчцы».

аднойчы, цёпла, радасць, справа, злева, раптам, побач, хутка, рашуча, нядрэнна

Сказы запішыце. Прыслоўі падкрэсліце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Выпішыце 4 сказы з прыслоўямі з падручніка па літаратурным чытанні.

**55**

**1.** Са слоў кожнага радка пабудуйце сказы. Перастаўце сказы так, каб атрымалася апавяданне. Дайце загаловак. Запішыце.

(*да*)дому, і, рукі, на, падняла, дзяўчынка, вавёрачку, асцярожна, прынесла
раптам, заўважыла, пад, Ніна, кустом, вавёрачку
у, аднесла, Ніна, вясной, лес, зноў, вавёрачку
сядзеў, (*не*)рухома, звярок
у, былі, лесе, з, Ніна, мамай
яе, даглядала, Ніна, карміла

Падкрэсліце прыслоўі (_ _ _).

**2.** Перакладзіце на беларускую мову сказы.

1. Весело и звонко звенит весенний ручеёк.
2. Ночью в летнем саду поют соловьи.
3. Неожиданно началась гроза.
4. Незаметно пролетело лето.

Запішыце. Падкрэсліце прыслоўі.

?

1. Што абазначаюць прыслоўі?
2. На якія пытанні яны адказваюць?
3. Ад якіх слоў у сказах залежаць прыслоўі?



Правообладатель Издательский центр БГУ

56

# СКАЗ

**Успомніце.** Тэкст складаецца са сказаў.
У сказе гаворыцца пра каго-небудзь або пра што-небудзь.
Сказ складаецца са слоў, якія звязаны паміж сабой па сэнсе, форме, інтанацыі.
На пісьме кожны сказ пачынаецца з вялікай літары, а ў канцы яго ставіцца кропка, пытальнік або клічнік.
Словы ў сказе называюцца членамі сказа.
Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа.
Да галоўных членаў сказа могуць далучацца іншыя словы — даданыя члены сказа.

**1.** Прачытайце словы. Са слоў кожнага радка складзіце сказы.

кніга, многа, у, цікавая, наша, бібліятэка
я, прачытаць, першадрукар, пра, нядаўна, беларускі
ён, беларуская, першым, мова, надрукаваць, кніга
Полацк, Францыск Скарына, у, нарадзіцца
імя, вуліца, яго, плошча, назваць, і, бібліятэка
мова, мы, любіць, свая, родная

Сказы запішыце. Сказ пра Францыска Скарыну разбярыце па членах сказа.

**2.** Прачытайце тэкст. Падзяліце яго на сказы.

Каля нашай школы расце шмат кветак іх **пасадзілі** вясной самі школьнікі летам дзеці па чарзе даглядалі іх а першага



Правообладатель Издательский центр БГУ

верасня святочная школа сустрэне сваіх выхаванцаў **асеннімі** кветкамі.

Запішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. Выдзеленыя словы падзяліце для пераносу.

**3.** Прачытайце словы.

акварыум, аўтобус, дарога, дождж, косць, кошка, малако, парасон, рыбка, сабака

Злучыце словы ў лагічныя пары па ўзоры.
Узор: *кошка — малако*.

Запішыце лагічныя пары. З кожнай парай складзіце сказы.

**4.** Прачытайце тэкст.

На беразе Віліі раскінуўся сасновы бор. Каля самай вады важна пахаджвалі буслы. Птушкі па-гаспадарску аглядалі лагчыну. Непадалёк пасвіўся статак. Але буслы не звярталі на яго ніякай увагі. Яны займаліся сваёй справай.

Спішыце. Падкрэсліце галоўныя і дададзеныя члены сказа.

> **Успомніце.** Два словы, звязаныя паміж сабой па сэнсе, — гэта словазлучэнне. Сувязь слоў вызначаецца па пытаннях: *брат* (які?) *малодшы, ідзе* (куды?) *у школу.*
> Слова, ад якога ставіцца пытанне (*брат, ідзе*), галоўнае ў словазлучэнні, а тое, да якога ставіцца пытанне (*малодшы, у школу*), — залежнае.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**57**

**1.** Прачытайце пары слоў.

прыгожая школа, школьны агарод, блізкі лес, бераг ракі, цячэ рэчка, жыта каласіцца, шырокая дарога, падводная лодка, птушкі прылятаюць, зламаная галінка, сонца ўзышло, ад'ехала ад школы, вастрыё іголкі

Запішыце словазлучэнні па ўзоры: *прыгожая* (што?) *школа*.

Якія пары слоў словазлучэннямі не з'яўляюцца? Назавіце іх.

**вастрыё**

С. п. **2.** Прачытайце тэкст.

Паступова моцны дождж сціх. Вясёлка перакінула свой рознакаляровы мост праз раку. Лівень абмыў стомленую гарачынёй зямлю. На траве пад сонцам заблішчалі іскрыстыя кропелькі расы.

• Выпішыце са сказаў галоўныя члены сказа па ўзоры: *Дождж сціх.*

• Запішыце апошні сказ. Выпішыце з яго ўсе словазлучэнні па ўзоры: *кропелькі* (чаго?) *расы*.

• Выпішыце са сказаў галоўныя члены па ўзоры. Складзіце і запішыце з імі новыя сказы.

Узор: *Дождж сціх. Пад вечар дождж сціх.*

**3.** Складзіце словазлучэнні па ўзоры: *выраслі (лес) — выраслі ў лесе.*

Ужывайце, дзе трэба, прыназоўнікі.

выраслі (*лес*), сядзелі (*дрэва*), прыгожаму (*дзень*), светлым (*пачуццё*), вучыцца (*школа*), дапамагаць (*брат*), роднай (*мо-*



Правообладатель Издательский центр БГУ

*ва*), старэйшай (*сястра*), ехаць (*дарога*), знайсці (*рашэнне*), працаваць (*ахвота*), пасласць (*тэлеграма*)

Словазлучэнні запішыце. Вусна складзіце з імі сказы.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Апалі з дрэў жоўтыя лісточкі. Залацістым дыванам разасланіся па зямлі. Ляжаць яны нерухома.

Раптам з'явіўся лёгкі ветрык. Ускалыхнуў лісточкі, падкінуў іх уверх. Мігцяць без супынку жоўтыя лісточкі ў паветры і зноў падаюць на зямлю.

*Паводле Зоські Верас*

• Спішыце першыя тры сказы. Падкрэсліце ў кожным з іх галоўныя члены.

• Выпішыце сказы пра лёгкі ветрык. З аднаго з іх выпішыце спачатку дзейнік і выказнік, а потым усе словазлучэнні.

• Складзіце і запішыце тры сказы на тэму «Лістапад». У кожным сказе падкрэсліце галоўныя і даданыя члены.

**58**

**1.** Аднавіце сказы, з якіх былі вылучаны дадзеныя словазлучэнні.

| | |
|---|---|
| Узор: (якое?) | (за што?) |
| *Сонца чырвонае* | *закацілася за лес* |

*Чырвонае сонца закацілася за лес.*

| | |
|---|---|
| (якія?) | (якая?) |
| зоркі яркія | цішыня поўная |
| (на чым?) | (дзе?) |
| успыхнулі на небе | стаяла навокал |



Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| (чаго?) | (чаго?) |
| святло месяца | лісце дрэў |
| (на што?) | (якое?) |
| падала на лісце | лісце пажоўклае |

Сказы запішыце. Падкрэсліце ў іх галоўныя і дададзеныя члены сказа.

**2.** Прачытайце словы.

гарачае, невысокае, шчодрае, высокае, мужнае, халоднае, падманлівае, соннае, прамяністае, яснае, скупое

• Выберыце словы, якія характарызуюць вясенняе сонца. Запішыце словазлучэнні.

• Са словазлучэннямі складзіце сказы і запішыце іх. Падкрэсліце галоўныя члены.

• Паназірайце за сонцам у ясны дзень вясной. Якое яно? Складзіце і запішыце аб гэтым тры сказы.

С. п. **3.** Прачытайце радкі слоў. Знайдзіце ў кожным радку «лішняе» слова.

пачала, мурашка, вусень, камар, дзіця, конік
зубр, заяц, баран, вавёрка, рысь
рамонак, васілёк, ружа, півоня, авадзень, гладыёлус
круг, трохвугольнік, указка, авал, чатырохвугольнік
Саша, Дзіма, Мікола, Пятроў, Ігар

Складзіце і запішыце словазлучэнне з кожным «лішнім» словам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Складзіце сказы па пытаннях.

Хто? што зрабіў? з чаго? што?
Калі? як? хто? што зрабілі? куды?

Сказы запішыце. Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік і выказнік.

**59**

**Успомніце.** Сказы могуць быць развітымі або неразвітымі.
Сказ, які складаецца толькі з галоўных членаў, называецца **неразвітым**.
Сказ, які складаецца з галоўных і даданых членаў, называецца **развітым**.

**1.** Прачытайце тэкст.

Імжыць дожджык. Чырвоныя вяргіні намоклі і пацямнелі. Але вось вецер разагнаў нізкія хмары. Засвяціла сонейка. На кожнай кветцы заіскрыліся маленькія зорачкі.

- Выпішыце неразвітыя сказы.
- Выпішыце развітыя сказы. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены.
- Складзіце два развітыя і два неразвітыя сказы па ўзоры: *Вее вецер. З поўначы вее халодны вецер.*

**2.** Прачытайце неразвітыя сказы, перакладзіце іх на беларускую мову. Перабудуйце іх у развітыя.

Наступило утро. Светит солнце. Дети собрались. Зарядка началась.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Запішыце развітыя сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

Раскажыце, як у вас праходзіць ранішняя зарадка. Выкарыстоўвайце развітыя і неразвітыя сказы.

С. п. **3.** З наступных слоў складзіце сказы.

вясенні, цёплы, стаяў, дзень
з-пад, ядлоўцу, кусточка, грыбок, вылез, беленькі
у, час, я, вольны, шмат, чытаю
з, чуліся, вуліцы, галасы, дзяцей, гучныя
у, матылёк, уляцеў, акно, расчыненае

● Запішыце сказы.

● Выпішыце з кожнага сказа дзейнік і выказнік. Складзіце з імі новыя развітыя сказы.

● Складзіце і запішыце чатыры развітыя сказы пра вясновыя дні. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены.

**4.** Прачытайце ў левым слупку неразвітыя сказы. Злучыце іх па сэнсе са словамі ў правым слупку.

| | |
|---|---|
| Бабуля пакарміла | урокі на заўтра. |
| Ветрык вядзе | вяночак з сініх васілёчкаў. |
| Косця падрыхтаваў | дзяцей смачным абедам. |
| Верачка спляла | прыемную размову з травамі і кветкамі. |

Запішыце развітыя сказы.

**60**

**Успомніце.** Сказы бываюць **простыя** і **складаныя**. У складаным сказе можна выдзеліць дзве і больш частак. Кожная



Правообладатель Издательский центр БГУ

з іх падобная да простага сказа, але ўсе часткі складанага сказа звязаны па сэнсе і інтанацыяй. Часткі складанага сказа звычайна аддзяляюцца адна ад адной коскай. Яны могуць злучацца словамі ***і, а, але, каб, таму, што, калі, дзе*** і інш. Гэтыя словы называюцца **злучнікамі**.

**1.** Прачытайце. Знайдзіце сказы, якія складаюцца з дзвюх частак, падобных да асобных сказаў.

У небе ўспыхнуў першы прамень сонца, і начная цемра схавалася ў густую лістоту дрэў. З-пад каменя выбеглі зялёныя яшчаркі і заміргалі соннымі вочкамі.

Над кветкамі кружацца залацістыя пчолы і прагна п'юць салодкі сок.

У кустах скачуць вясёлыя чыжы, а ў паветры носяцца хуткакрылыя ластаўкі.

Выпішыце складаныя сказы. Падкрэсліце словы, якімі злучаюцца часткі складаных сказаў.

**2.** Прачытайце тэкст.

Надышла ноч і надвор'е змянілася. Хлопчык ніяк не мог заснуць бо за вокнамі бушавала навальніца. Неба над горадам было хмарнае і ў паветры адчуваўся пах дажджу. Сонца не відаць было за дамамі але яно яшчэ не зайшло.

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Складзіце (вусна) два-тры сказы пра начную навальніцу. Выкарыстайце складаныя сказы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Складзіце складаныя сказы са сказаў левага і правага слупкоў. Выкарыстайце патрэбныя злучнікі.

| | |
|---|---|
| Прылятаюць буслы. | Бяздоннае сіняе неба ажывае. |
| Ідзе сяўба. | Пераклікаюцца над палямі жаўрукі. |
| Надыходзіць вясна. | Зялёным дываном пакрываюцца лугі. |

Сказы запішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**4.** Прачытайце тэкст.

**Сябры**



Я з вудачкамі стаіўся пад вярбой. На суседнім кусце сядзіць і падае́ свой галасок аўсянка. Кожны з нас сваім заняты. Я лаўлю залатых карасёў, а мая суседка пільнуе маленькіх птушанятак у мяккім гняздзечку. Птушачка прывыкла і зусім не баіцца мяне. Добра нам на азярцы. Адзін аднаму не замінаем.

*Паводле Рыгора Ігнаценкі*

Спішыце. Падкрэсліце складаны сказ.

## 61 АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

**Успомніце.** Аднароднымі называюцца члены сказа, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне і адносяцца да аднаго і таго ж слова.

Аднароднымі бываюць як галоўныя, так і даданыя члены сказа.

Паміж аднароднымі членамі сказа на пісьме ставіцца коска.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце тэкст.

### Дождж у лесе

Асіны, бярозы гнуцца пад парывамі ветру. Сосны, елкі грозна шумяць. А вецер злуецца, завывае, стогне. Хмары пацямнелі, насунуліся, паліліся на зямлю халодныя кроплі. Стала холадна, змрочна.

Знайдзіце сказы з аднароднымі дзейнікамі і выказнікамі. Запішыце іх.

**2.** Складзіце дыялог. Выкарыстоўвайце сказы з аднароднымі членамі.

### Цырк

— Прабач, калі пачатак ранішняга прадстаўлення ў цырку?
— ... .
— Хто сёння будзе выступаць?
— ... .
— Якія выступленні падабаюцца табе ў цырку?
— ... .

**3.** Прачытайце.

У родныя мясціны вяртаюцца лясныя жаваранкі. Сонца ў небе ясна ззяе, шчодра лье сваё цяпло. Спее жыта, авёс, ячмень вусаты.

У якіх сказах ёсць аднародныя члены? Запішыце сказы з аднароднымі членамі сказа.

**4.** Прачытайце сказы. Устаўце патрэбныя злучнікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Горад наш не дужа вялікі, ... прыгожы. Кліча ў луг, ... не на ўрок сіні-сіненькі званок. У доктара лячыся, ... ў разумнага вучыся.

Сказы запішыце. Падкрэсліце злучнікі і аднародныя члены сказа.

**62**

**1.** Разгледзьце малюнак.



Словы для выкарыстання: *шумна і весела; хлопчыкі і дзяўчынкі; рыдлёўкі, граблі, палівáчкі, венікі; грушы, яблыні, слівы; кусты парэчак і агрэсту.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Складзіце невялікае апавяданне «На суботніку». Ужывайце аднародныя члены сказа.

Апавяданне запішыце.

**2.** Складзіце і запішыце сказы з аднароднымі дзейнікамі, аднароднымі выказнікамі, аднароднымі даданымі членамі сказа.

---

**63**

**Успомніце.** Пры аднародных членах сказа могуць быць словы, якія ад іх залежаць і іх паясняюць. Напрыклад: *Дзяўчынка выйшла* (куды?) ***у сад****, глянула* (на што?) ***на кветку****, усміхнулася* (як?) ***радасна***.

**1.** Прачытайце загадкі і адгадайце іх. Знайдзіце аднародныя члены сказа і словы, якія іх паясняюць.

Распрастала птушка крылы, ажно сонца ўсё закрыла.
Махнула птушка пяром, накрыла ўвесь свет крылом.

Спішыце. Падкрэсліце паясняльныя словы.

**2.** Прачытайце тэкст. Назавіце аднародныя члены сказа і словы, якія іх паясняюць.

Юрка пайшоў у сад узлез на яблыню нарваў яблыкаў. Раптам ён убачыў пад яблыняй чорны клубочак. Хлопчык нахіліўся да клубочка дакрануўся рукою. А ён калючы! Спалохаўся Юрка кінуў яблыкі пабег дадому. Мама засмяялася. Гэта ж вожык!

Пайшоў Юрка ў сад яблыкі забраць. А іх ужо няма, няма і вожыка. Куды ж яны падзеліся?

*Паводле Васіля Сухамлінскага*



Правообладатель Издательский центр БГУ

А як вы думаеце, куды прапалі яблыкі?

Спішыце, пастаўце знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа. Падкрэсліце паясняльныя словы.

**3.** Прачытайце.

Лес гамоніць і спявае.
Каля лесу працякала рака.
Па берагах рэк растуць вольхі, вербы, бузіна.
У лесе звінелі, пераліваліся птушыныя галасы.

Выпішыце сказы з аднароднымі членамі сказа.

**4.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце аднародныя члены сказа іншымі словамі.

Жыла на свеце мышка-нарушка. Вылезла яна (адкуль?) ... і гуляе (дзе?) ... . А за ёю пагнаўся кот. Мышка спалохалася (каго?) ..., уцякла (куды?) ... . Сядзіць мышка (дзе?) ..., калоціцца (ад чаго?) ад ... . А кот стаіўся (дзе?) ..., чакае (каго?) ... .

Спішыце. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

## 64

**Успомніце.** Аднародныя члены сказа звязваюцца паміж сабой інтанацыяй пералічэння. Паміж аднароднымі членамі сказа могуць ужывацца злучнікі ***і, а, але***. Калі злучнік ***і*** паўтараецца два або некалькі разоў, то паміж аднароднымі членамі ставіцца коска. Перад злучнікамі ***а, але*** коска ставіцца заўсёды.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вецер прабег па жыце і прыціх у кустах. Загулі ў кветках пчолы і птушыны льецца спеў. Трактар арэ барануе сее малоціць.

Выпішыце спачатку сказы з аднароднымі членамі сказа, а потым складаныя сказы. Пастаўце, дзе трэба, коскі.

**2.** Прачытайце. У якім сказе няправільна пастаўлены знакі прыпынку пры аднародных членах?

Рэчка была не вельмі шырокая, але глыбокая.
Праўда ў агні не гарыць, і ў вадзе не тоне.
Край беларускі славіцца залатымі нівамі, празрыстымі рэкамі, сінімі азёрамі.

Запішыце сказы правільна.

**3.** Складзіце і запішыце тры сказы: адзін — з аднароднымі дзейнікамі, другі — з аднароднымі выказнікамі, трэці — з аднароднымі даданымі членамі сказа.

**4.** Прачытайце. З кожнай парай сказаў складзіце і запішыце адзін сказ.

1. Праца чалавека корміць. Праца радасць прыносіць.
2. Вучні прыйшлі ў майстэрню. Вучні адразу ўзяліся за работу.
3. У вольны час дзеці беглі ў лес. Дзеці прыносілі многа ягад.

**68**

**1.** Прачытайце. Устаўце ў сказы патрэбныя злучнікі ***і, а, але***.

Я жыву не ў горадзе ... ў вёсцы. Гэты верш прыгожы ... сумны. Дождж ішоў днём ... не ноччу. Даша піша прыгожа ... павольна. Мама гатуе хутка ... смачна.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі. Падкрэсліце аднародныя члены сказа згодна ролі, якую яны выконваюць.

**2.** Прачытайце. Вызначце аднародныя члены сказа.

Цэлае лета сярод лугавых красак і траў ткуцца белыя карункі рамонкаў. Кветкі радуюць вока аздабляюць сціплым хараством наваколле. Нездарма людзі прысвяцілі рамонкам шмат цудоўных песень і вершаў. На свята Івана Купалы моладзь збіраецца каля ракі водзіць карагоды кідае ў раку вянкі з рамонкаў.

Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі.

**3.** Прачытайце.

У садку растуць дзьмухаўцы. Ноччу яны адпачываюць сціскаюцца ў тугія пупышкі.

Раніцай кветкі запальваюць свае яркія жоўтыя сонейкі.

Выпішыце сказы з аднароднымі членамі сказа. Пастаўце, дзе трэба, коскі. Падкрэсліце аднародныя члены сказа згодна ролі, якую яны выконваюць у сказе.

**4.** Прачытайце.

Раніца была пахмурная але бязветраная.
Шануй і паважай працу кожнага чалавека.
Я думаю аб міры аб шчасці і спакоі на зямлі.

Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі.

## 69

**1.** Прачытайце і адгадайце загадкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вызначце ў сказах аднародныя члены сказа. Якім членам сказа яны з'яўляюцца?

Конь стальны аўса не просіць а арэ і косіць. Плача і вые гуляе па волі толькі рукамі не возьмеш ніколі. Не ходзіць не плавае а стаіць пры гасцінцы прыгажуня бялявая ў зялёнай хусцінцы.

Запішыце, пастаўце, дзе трэба, коскі.

**2.** Прачытайце сказы.

Вучні дапамагаюць дарослым убіраць ураджай.
Вучні дапамагаюць дарослым убіраць буракі, моркву, капусту.
Руплівыя пчолы збіраюць мёд.
Руплівыя і працавітыя пчолы збіраюць мёд.
Сонца свеціць, але не грэе.

Выпішыце сказы з аднароднымі членамі сказа.
Падкрэсліце іх.

**3.** Прачытайце. Падзяліце на сказы.

Асіны бярозы гнуцца пад парывамі ветру грозна шумяць сосны елкі у лесе моцна завывае свішча вецер.

Сказы запішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

**4.** Дапоўніце сказы аднароднымі членамі.

Вясной прыляцелі гракі, ..., ..., ... .
У рэках Беларусі водзяцца шчупакі, ..., ..., ... .
У лесе я назбіраў поўны кошык баравікоў, ..., ..., ... .



Правообладатель Издательский центр БГУ

Сказы запішыце. Падкрэсліце аднародныя члены згодна ролі, якую яны выконваюць у сказе.

**70**

**1.** Прачытайце. Размясціце абзацы так, каб атрымаўся тэкст.

### Ляці, верабейка!

Неяк прыляцела чародка вераб'ёў і села на галлё. Пачуў іх верабей і зашчабятаў. Хлопчык адчыніў акно і выпусціў **птушку** на волю.

Праз адчыненае акно ў пакой заляцеў верабей. Андрэйка не захацеў выпускаць **птушку**. Хлопчык старанна даглядаў вераб'я.

Здарылася так, што хлопчык прастудзіўся. Мама забараніла **хлопчыку** гуляць на вуліцы. Андрэйка зноў стаў старанна даглядаць вераб'я. Але **верабей** не хацеў забаўляцца з Андрэйкам. Не цырыкаў. Заб'ецца ў куток і сядзіць моўчкі.

Андрэйка нацешыўся **вераб'ём**, але выпускаць з кватэры ўсё роўна не хацеў.

*Ніна Маеўская*

Выдзеленыя словы замяніце займеннікамі. Перакажыце тэкст. Пераказ запішыце.

**2.** Прачытайце. Вызначце ў сказах аднародныя члены сказа.

Стракаты дзяцел выдзеўб адтуліну ў здаровай драўніне дабраўся да гнілой сярэдзіны. Сінічкі тут жа падхопліваюць трэскі і выносяць з дупла. Снуюць птушкі туды-сюды завіхаюцца. Разам весялей і хутчэй любая работа робіцца.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Спішыце. Падкрэсліце аднародныя члены сказа, пастаўце, дзе трэба, коскі.

?

1. Якія члены сказа называюцца аднароднымі?
2. Як звязваюцца паміж сабой аднародныя члены сказа?
3. Перад якімі злучнікамі заўсёды ставіцца коска?
4. Калі ставіцца коска перад злучнікам ***і***?

**71**

# ТЭКСТ

**Тэкст** — гэта закончанае паведамленне, якое складаецца са сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе. Яны аб'ядноўваюцца пэўнай тэмай і асноўнай думкай.

**Тэма** — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце.

**Асноўная думка тэксту** — гэта тое галоўнае, што аўтар хоча паведаміць чытачу.

Тэкст можна падзяліць на абзацы. Пры дапамозе абзаца (або чырвонага радка) выдзяляюцца найбольш важныя моманты, падзеі, пра якія расказваецца ў тэксце.

**1.** Прачытайце тэкст. Пра што ў ім гаворыцца? Вызначце тэму. Прыдумайце загаловак.

Вузкая сцежка вядзе да балота. Раптам на балота апусціўся журавель. Ён узняў галаву і гучна крыкнуў тры разы. Праз хвіліну сюды прыляцелі яго сябры.

Першы журавель стаў на сярэдзіне палянкі, паглядзеў на ўсіх і падскочыў. Жураўлі ўзмахнулі крыламі і пачалі свае танцы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Калі сонца паднялося высока, крылатыя танцоры разляцеліся. Заўтра яны зноў сустрэнуцца на гэтай палянцы.

*Паводле Язэпа Зазекі*

Спішыце другі абзац. Падкрэсліце аднародныя члены.

**2.** Прачытайце тэкст. Падзяліце яго на сказы. Падумайце, чаму тэкст так называецца.

**Незвычайны грыбнік**

На лясной паляне было шмат грыбоў аббяжыць Толік раненька палянку і набярэ поўны кошык маладзенькіх баравічкоў

Аднойчы прыбег хлопчык на палянку і ўбачыў адны карэньчыкі хто гэта пабываў тут праз два дні ён зноў прыйшоў сюды вось нешта зашастала за арэхавым кустом на паляну выйшаў лось панюхаў паветра і пачаў адкусваць тоўстымі губамі шапачкі баравікоў Толік сцішыўся за тоўстым дрэвам такога незвычайнага грыбніка ён ніколі не бачыў

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**3.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Прыдумайце загаловак.

У Колі быў дзень нараджэння. Тата падарыў яму веласіпед.

Назаўтра хлопчык выехаў на двор на новенькім веласіпедзе. Там ужо яго сябры каталіся на сваіх старых веласіпедах.

Кожнаму хацелася праехаць на новенькім веласіпедзе, але Коля ўсім адмовіў.

Дзеці адышліся ад Колі і больш не падыходзілі да яго. Неўзабаве хлопчык застаўся адзін на двары.

*Паводле Лідзіі Арабей*



Правообладатель Издательский центр БГУ

- Спішыце апошні абзац. Вусна пастаўце да сказаў пытанні.
- Складзіце план тэксту. План запішыце.
- Складзіце і запішыце тры сказы пра Колю.

**4.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Прыдумайце загаловак.

Маленькая Каця ішла па вуліцы. Дзяўчынка несла ў кошыку яблыкі. Раптам з-за вугла выбег вялікі калматы сабака. Каця спалохалася і выпусціла кошык з рук. Яблыкі рассыпаліся па дарозе. Дзяўчынка заплакала.

Гэта ўбачыў Сярожа. Хлопчык падбег да Каці. Ён дапамог дзяўчынцы сабраць яблыкі.

Спішыце. Першы сказ разбярыце па членах сказа: падкрэсліце дзейнік і выказнік, пастаўце пытанні да дадзеных членаў.

---

**72**

**1.** Уважліва прачытайце абзацы тэксту. Пастаўце іх так, каб атрымалася апавяданне.

**Беларускае мора**

Плошча яго — восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня — трыццаць пяць метраў. Знаходзіцца яно на паўночным захадзе Мінскай вобласці.

Беларускім морам нярэдка называюць Нарач. Гэта самае вялікае возера ў Беларусі.

Каля самага берага б’е з-пад зямлі крыніца з серабрыстай сцюдзёнай вадой. Тут такіх крыніц многа. Вада ў возеры гаючая, карысная для здароўя.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Нарач належыць да азёр, якія не зарастаюць раслінамі. Вада ў возеры празрыстая, багатая на кісларод.

Апавяданне запішыце.

**кіламе́тр**

**2.** Прачытайце тэкст. Падумайце, чаму ён так называецца.

**Журавы**

Пасля доўгай дарогі ля возера селі адпачываць журавы. Стомленыя, яны ноччу чысцілі на сабе пер'е, пілі з возера халодную ваду.

Узышло сонца, кінуўшы свае касыя прамяні на яшчэ сонны луг. Журавы выцягнулі ўверх доўгія шыі і трубнымі галасамі сустрэлі нараджэнне новага дня.

Як толькі туман крануўся з месца, пачулася радаснае курлыканне. Птушкі павольна пакінулі бераг возера і паляцелі насустрач сонцу.

*Паводле Рыгора Ігнаценкі*

Запішыце адзін абзац (на выбар).

Пастаўце да сказаў пытанні, запішыце іх.

**3.** Прачытайце верш. Якая яго асноўная думка? Прыдумайце загаловак.

Ну, як не любіць цябе, возера Нарач,
Цудоўнай прыроды куток?
Аб светлым, прыгожым тут хочацца марыць
І сцішыць ля возера крок.
Там бераг далёкі знікае ў прасторы,
Блішчыць, нібы срэбра, вада.
І з грывамі хвалі, амаль як на моры,
І чаек сям-там чарада.



Правообладатель Издательский центр БГУ

А верх хараства — лебядзінае дзіва,
Крыніц таямнічых выток,
Што з ціхім цурчаннем у Нарач імкліва
Цякуць па каменнях праз лог.

*Канстанцін Чубанаў*

Запішыце першы слупок па памяці. Успомніце легенду пра возера Нарач.

**4.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

**Родныя шляхі**

Ёсць штосьці незвычайна прыгожае ў прывольных шляхах Беларусі. Шырока і размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі. Колькі хараства і прывабнасці ў іх далях! Колькі новых малюнкаў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага!

Якая ж сіла закладзена ў гэтых прасторах родных і любімых шляхоў? Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі?

*Паводле Якуба Коласа*

Спішыце тэкст. Знайдзіце аднародныя члены сказа. Якімі часцінамі мовы яны выражаюцца?

73

## ТЫПЫ ТЭКСТАЎ

У тэкстах аўтары апавядаюць пра якія-небудзь падзеі або апісваюць людзей, жывёл, расліны ці прадметы. Часта ў тэкстах даецца разважанне аб прычынах падзей і з'яў. Таму тэксты бываюць наступныя: **тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне** і **тэкст-разважанне**.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## ТЭКСТ-АПАВЯДАННЕ

У тэксце-апавяданні паведамляецца пра дзеянні, падзеі (што было спачатку, што адбывалася потым, чым закончылася).

Да тэксту-апавядання можна паставіць пытанне: аб якіх падзеях ці з'явах гаворыцца ў тэксце?

**1.** Прачытайце тэкст і вызначце, аб якой падзеі тут гаворыцца. Дакажыце, што гэта тэкст-апавяданне.

**Наташын букет**

Вясной мама ў гародчыку ўскопвала градкі. Наташа памагала ёй. Потым дзяўчынка сама пасеяла насенне кветак. А дзён праз колькі зазелянелі ўсходы. Усё лета Наташа клапатліва даглядала расліны. Летам на градцы расцвілі духмяныя гваздзі́кі і беласнежныя рамонкі, рознакаляровыя астры.

Першага верасня Наташа нарвала вялікі букет і панесла ў школу. Радасна было дзяўчынцы падарыць сваёй настаўніцы букет кветак.

Складзіце і запішыце план апавядання.

**2.** Прачытайце тэкст. А тут аб якой з'яве гаворыцца?

**Памочніца**

Шмат у Тані клопатаў. Прыйдзе яна дамоў са школы і ўсіх сваіх лялек дагледзіць: накорміць іх, напоіць, прычэша. Памые лялькам сукенкі, пакладзе іх спаць. І пра сястрычку Людачку не забудзе. Калі яна заплача, тады Таня сама сястру супакойвае або кліча маму.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Мама хваліць Таню і называе сваёй памочніцай.

*Паводле Валянціна Зуба*

Спішыце. Вызначце часціны мовы ў апошнім сказе.

**3.** Прачытайце верш. Пра якія дзеянні расказваецца ў гэтым вершы? У якой паслядоўнасці яны адбываюцца?

### Маленькая памочніца



Хоць маленькая Ганула,
А памочніца матулі.
Прыйдзе з школы і адразу
Не губляе дарма часу.
Паабедае — і ў краму,
Не чакае з працы маму.
Купіць тое, што і трэба:
Булак, яек, масла, хлеба...
Адпачне яна нямнога,
Падмяце ўсё, вядома,
Пагуляе каля дома...
Зробіць школьныя заданні
Без памылак, са стараннем.
Сшыткі, кніжкі, ручку, гумку
Зложыць акуратна ў сумку.
Посуд вымые Ганула,
Задаволена матуля.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Разгледзьце малюнак да верша. Складзіце 4—5 сказаў паводле верша і малюнка да яго. Сказы запішыце.

Раскажыце аб тым, як вы дапамагаеце сваёй матулі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце тэкст. Чаму ён так называецца?

### Як Галя сум прагнала

Сядзіць Галя на канапе і сумуе. І што рабіць з гэтым сумам?

Потым пайшла на кухню. На століку стаяла непамытая талерка, каструля. Дзяўчынка памыла талерку, паставіла на месца каструлю. Падмяла падлогу.

Галя навяла ўсюды чысціню і парадак. Прыйшла мама. Яна пахваліла Галю.

Прачытайце план апавядання і вызначце асобныя сэнсавыя часткі тэксту, якія адпавядаюць кожнаму пункту плана.

1. Галя сумуе.
2. Дзяўчынка на кухні.
3. Прыйшла мама.

Перакажыце апавяданне па плане. Пераказ запішыце.

## 74 ТЭКСТ-АПІСАННЕ

Тэкст-апісанне не расказвае пра падзеі, а апісвае, характарызуе прадметы, людзей, жывёл, прыроду і г. д.

Усё, пра што ў ім гаворыцца, існуе адначасова. Змест апісання падобны да карціны, толькі яна намалявана не фарбамі, а словамі.

Да тэксту-апісання можна паставіць пытанні: ***які? якая? якое? якія?***

**1.** Прачытайце тэкст. Дакажыце, што гэта тэкст-апісанне.

Восень прыйшла багатая, шчодрая, прыгожая. Дрэвы стаяць рознакаляровыя. Зямля ў лесе засыпана мяккім лісцевым



Правообладатель Издательский центр БГУ

дыванам. Плыве павуцінне. Не чуваць птушыных галасоў. Цішыня і спакой пануюць навокал.

Спішыце тэкст. Два сказы разбярыце па часцінах мовы (на выбар).

**2.** Прачытайце тэкст. Вызначце, аб чым у ім ідзе гаворка. Які гэта тэкст (апісанне ці апавяданне)? Прыдумайце загаловак.

Яшчэ нядаўна на лузе калыхаліся зялёныя травы. Над кветкамі завіхаліся пчолы.

Цяпер там пуста. Толькі стагі засталіся на пожнях. Буслы пазляталі з гнёздаў і ходзяць па лугах.

Апусцелі палі. Не трапечуцца ў небе над полем жаваранкі са сваімі песнямі.

Прайшла вясёлая пара лета.

Прачытайце план апісання і вызначце асобныя сэнсавыя часткі тэксту, якія адпавядаюць кожнаму пункту плана.

1. На лузе летам.
2. Восень прыйшла.
3. У полі восенню.

На кожны пункт плана складзіце сказы паводле тэксту і запішыце іх.

**3.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



Што гэта за звярок? Чым ён абараняецца? Які ў яго носік? Якія лапкі? Да чаго падобны яго вочкі? Чым харчуецца? Як зімуе?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Адказы запішыце. Які атрымаўся тэкст — апісанне ці апавяданне? Дакажыце.

**4.** Прачытайце тэкст. Пастаўце да яго пытанне. Вызначце, які гэта тэкст (апісанне ці апавяданне).

Ужо ў пачатку кастрычніка наша беларуская прырода поўная велічы і прыгажосці. Асабліва яна цудоўная ў цёплыя пагодлівыя дні бабінага лета.

Васковай свечкай красуецца бярозка. На ёй блішчыць не адна залатоўка. Жоўтую шапку адзеў разгалісты клён. Барвовым факелам гарыць на фоне зялёнай хвоі асінка. Стаіць яна, як вясковая красуня. Якая прыгажосць!

*Паводле Рыгора Ігнаценкі*

Выпішыце апісанне бярозкі.

## 75

Тэкст-апісанне і тэкст-апавяданне цесна звязаны паміж сабой і рэдка могуць абысціся адзін без аднаго. Часцей за ўсё іх можна сустрэць разам.

**1.** Прачытайце тэкст. Вызначце, пра што ў ім ідзе гаворка. Які гэта тэкст? Дакажыце.

Пачынаецца восень. Сонца свеціць, ды не грэе. Часта дзьме вецер. Часам ідзе дождж. Восень цягнецца тры месяцы: верасень, кастрычнік, лістапад.

Верасень — таму што ў гэтым месяцы зацвітае верас маленькімі лілова-ружовымі кветкамі. Памятаеце?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вырас верас і цвіце.
Восень, верасень ідзе.

Так пісаў паэт Васіль Жуковіч.

• Выпішыце апісанне пачатку восені. Падкрэсліце ў сказах дзейнік і выказнік.

• Выпішыце сказы пра верасень. Гэта апісанне ці апавяданне?

• Знайдзіце ў дапаможніках паходжанне назваў «кастрычнік» і «лістапад». Запішыце.

**2.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце пачатак тэксту.



У беларускіх лясах сустракаецца дзіўная птушка.

Гэта сава. Яна ўся бура-карычневая. Галава...

Прадоўжыце апісанне савы. Раскажыце, якая ў яе галава. Якія вочы? Якая ў яе дзюба? Дзе жыве сава? Чым корміцца? Чаму яе называюць начной драпежніцай?

Які тэкст у вас атрымаўся: апісанне ці апавяданне? Тэкст запішыце.

**3.** Прачытайце тэкст. Адгадайце, пра каго ён. Прыдумайце загаловак.

... — дбайная і клапатлівая гаспадыня. Яна нарыхтоўвае сабе запасы на зіму. Арэхі і жалуды ... хавае ў глыбокім дупле і пад каранямі дрэў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

У такіх кладоўках ... трымае толькі добрыя арэхі. Яна ўмее адрозніваць арэх з добрым зернем пад шкарлупкай ад пустога ці чарвівага.

Сушыць ... і грыбы на зіму. Развешвае іх на галінках дрэў. Грыбы сохнуць на паветры і зімой спатрэбяцца гаспадыні.

*Паводле Віталя Вольскага*

Які гэта тэкст: апісанне або апавяданне?

- Запішыце. Устаўце прапушчаныя словы.
- Складзіце план тэксту. План запішыце.
- Складзіце план. Перакажыце па плане. Пераказ запішыце.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак.





Ішоў аднойчы паляўнічы па лесе. Раптам наткнуўся на ўлюбёнае месца цецерукоў.

Цецярук — птушка вельмі прыгожая. Апярэнне чорнае з фіялетавым адценнем. На крылах — белая палоска. Брыво чырвонае.

Жывуць цецерукі ў лесе. Гняздо на зямлі маскіруюць травой ці галлём.

Паставіў паляўнічы чучала, а сам сеў на ўзлессі.

Раптам прыляцеў каршун — вялікі падорлік. Схапіў за галаву чучала і паляцеў. Падорлікі — рэдкія птушкі. Паляванне на іх забаронена. Паляўнічы стрэліў у паветра.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце пачатак дыялога. Прыдумайце прапушчаныя рэплікі.

— Мама, я запрасіў у госці новага сябра.
— ...?
— Яго завуць Алесем.
— ... ?
— На стадыёне. Ён вельмі добра гуляе ў футбол.
— ... ?
— ... .
— ... ?
— ... .

Дыялог запішыце.

**3.** Складзіце тэкст-дыялог па пачатку.

— Скажыце, калі ласка, як даехаць да школы-інтэрната?
— ... .
— ... ?
— ... .
— ... ?
— ... .

Дыялог запішыце.

**аптэ́ка**

**4.** Прачытайце дыялог.

— Скажыце, калі ласка, як прайсці да аптэкі?
— А вось яна, блізенька, на перакрыжаванні вуліц.
— Дзякуй за дапамогу!
— Няма за што.

Якія яшчэ словы падзякі вы ведаеце? Запішыце іх.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Прачытайце сказы.

Колькі ты маеш выхадных дзён на тыдзень? Два дні — субота і нядзеля. Як ты бавіш выхадны дзень? У выхадны я люблю гуляць па лесе. Прыходзь да нас у наступную суботу. Дзякуй за запрашэнне. Але я маю намер паехаць у лес за апенькамі. Паедзем разам. З задавальненнем.

Запішыце ў форме дыялога. Пастаўце знакі прыпынку.

**79**

## ТЭКСТ-МАНАЛОГ

Тэкст-маналог перадае мову адной асобы, у якой няма суразмоўцы.

**1.** Прачытайце верш. Здагадайцеся, хто гэта пра сябе расказвае. Замест кропак устаўце патрэбнае слова.



Я зярняткам быў спачатку,
потым — коласам на ніве.
Потым, стаўшы зноў зярняткам,
на таку пабыў, на мліве.
А з пякарняў парадніўся —
на сталах у вас з’явіўся.
Быць заўжды руплівым трэба,
каб не быць без ... .

*Мікола Сівец*

Абгрунтуйце вывад. Спішыце верш. Падкрэсліце словы, якія дапамагаюць адгадаць загадку.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце ўрывак з апавядання Янкі Маўра «Васька Жукаў». У ім галоўны герой, які вучыцца ў Мінску, піша ліст свайму дзеду.

Мілы дзядуля Іван Сцяпанавіч!

Я пішу табе пісьмо. Вітаю цябе з надыходзячым святам і жадаю ўсяго добрага. Няма ў мяне ні таткі, ні мамкі, толькі ты адзін застаўся. Мінск — горад вялікі, ды толькі зруйнаваны. Гэта фашысты яго так знішчылі. Але ўсюды ідзе будоўля. Я часта бачу на будаўнічых пляцоўках такіх самых хлопцаў, як і я. Я б хацеў вывучыць усе навукі і ўсе майстэрствы.

Прыязджай, мілы дзядуля, паглядзець на наша жыццё.

Да пабачэння.

Твой унук Васіль Жукаў.

З чаго трэба пачынаць пісаць ліст?

Якія ветлівыя словы сустракаюцца ў лістах?

Чым павінен заканчвацца ліст?

Напішыце ліст свайму сябру (сяброўцы). Апішыце ваш горад (вёску).

**3.** Прачытайце ўзор ліста-віншавання. Звярніце ўвагу на тое, як трэба звяртацца да дарослых; да сваіх равеснікаў.

Паважаныя Зінаіда Іванаўна і Анатоль Леанідавіч!

Дарагая Іра!

Уся наша сям'я віншуе вас са святам! Жадаем вам добрага здароўя і радаснага настрою. А табе, Ірачка, добрых адзнак і верных сяброў. Пішыце нам. Да пабачэння.

Сям'я Пятроўскіх



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Напішыце ліст-віншаванне з днём нараджэння свайму сябру (сяброўцы).

**80**

**1.** Прачытайце тэкст. Гэта тэкст-маналог ці тэкст-дыялог? Дакажыце.

Ці любіце вы восень? Я вельмі люблю яе. Восень багатая, прыгожая. Дрэвы стаяць у залатым убранні.

Зямля падобна на рознакаляровы дыван. Глядзіш, не наглядзішся. А колькі багацця восенню! У садах яблыкі, слівы, грушы. У агародах памідоры, агуркі, бульба, буракі, цыбуля. У лесе безліч грыбоў. Усё спелае, свежае, сакавітае. Шчодрая пара года — восень!

- Выпішыце сказы, якія даказваюць, што восень прыгожая.
- Выпішыце сказы, якія даказваюць, што восень шчодрая.
- Напішыце 4—5 сказаў аб тым, як вы ставіцеся да гэтай пары года. Які атрымаўся тэкст? Дакажыце.

**2.** Прачытайце ўрывак з верша. Гэта тэкст-маналог ці тэкст-дыялог? Запомніце, па якім нумары тэлефанаваць, калі ўзнікне патрэба.

**Тэлефон**

А я даведнік прачытаў
І нумары запамінаў.
Няцяжка ўсе спачатку
Запомніць па парадку.
Калі будынак у агні,
Па 101 хутчэй звані.

Калі здараецца бяда,
Звані ў міліцыю — 102.
Калі патрэбны дактары,
Звані на «хуткую» — 103.
Калі з пліты выходзіць газ,
Па 104 — у Мінгаз.

*Уладзімір Мацвеенка*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Па якім нумары трэба званіць, калі ўзнікне пажар?
Па якім нумары можна пазваніць у міліцыю?
Як выклікаць па тэлефоне «хуткую дапамогу»?
Як пазваніць у Мінгаз?

**3.** Складзіце (вусна) тэкст тэлефоннай размовы на тэму «Пажар». Гэта тэкст-маналог ці тэкст-дыялог?

Якія рэплікі пры такой размове абавязкова патрэбна выкарыстоўваць?

**чацвёрты, тава́рыш**

**4.** Прачытайце расказ вучняў чацвёртага класа. Гэта тэкст-маналог ці тэкст-дыялог?

Мы вучні чацвёртага класа. Першакласнікі сябруюць з намі. Яны — нашы малодшыя таварышы. На перапынках мы гуляем з імі. Яны яшчэ шмат чаго не ўмеюць. Мы з імі малюем, спяваем, танцуем, чытаем ім цікавыя кніжкі. Разам з малымі вучні нашага класа арганізавалі вечар казак.

Спішыце. Раскажыце аб тым, як вы сябруеце з першакласнікамі.

**81**

У тэксце сказы могуць звязвацца кветачкай або ланцужком.

Калі з першым сказам звязаны ўсе астатнія, то атрымліваецца **кветачка**.

Калі другі сказ звязаны з першым, трэці — з другім і гэтак далей, то атрымліваецца **ланцужок**.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце тэкст.

Аднаго разу, ідучы вясною па алеі, высаджанай таполямі, я падняў пару зрэзаных атожылкаў.

Дома я апусціў атожылкі ў бутэльку з вадою і паставіў на акне. Цяпер у мяне з'явіўся прыемны клопат: я памагаў вярнуць жыццё будучым дрэўцам. *Паводле Алеся Пальчэўскага*

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак.

Як звязаны сказы — кветачкай ці ланцужком?

Тэкст запішыце.

**2.** Прачытайце тэкст.

Прыемная пара́ — канікулы! Можна чытаць кнігу, глядзець тэлевізар, слухаць радыё, хадзіць на канцэрт. Можна доўгі час гуляць на вуліцы, наведаць бабулю і дзядулю. Галоўнае — не дарэмна бавіць час.

Прыдумайце загаловак.

Як звязаны сказы — кветачкай ці ланцужком? Тэкст запішыце.

**3.** Прачытайце. Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст.

На беразе засталіся толькі ласіныя сляды.
За ім ішла ласіха.
Жывёлы напіліся свежай рачной вады і зніклі ў лесе.
Каля ракі паказаўся лось.

Прыдумайце загаловак. Тэкст запішыце.

Як звязаны сказы — кветачкай ці ланцужком?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Яшчэ ў глыбокай старажытнасці нашы продкі з валокнаў ільну выраблялі палатно, вілі вяроўкі і шпагат з палатна людзі шылі адзенне, а з ільняных нітак плялі мярэжы імі лавілі рыбу ў паўнаводных рэках і азёрах лён не толькі апранаў нашых продкаў, але і карміў іх. *Паводле Змітрака Марозава*

**82**

**1.** Разгледзьце малюнак.



Адкажыце на пытанні:

1. Дзе будуюць бабры свае хаткі?
2. Якое бабровае жыллё?
3. Як жывуць бабры?
4. Што яны ядуць?
5. Што робяць звяркі ўдзень?
6. Чым займаюцца яны ўвечары і ноччу?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Словы для даведкі: *будуюць у вадзе, моцнае жыллё, жывуць сем'ямі, ядуць маладую лазу і асіннік, удзень адпачываюць, увечары і ноччу працуюць, валяць дрэвы, будуюць плаціны.*

Складзены тэкст запішыце.

**2.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

**Малады лес**

Непадалёку ад сяла вырас малады лес вароны разнеслі ўсім гэту радасную вестку звяры і птушкі перабраліся сюды і пачалі абжываць лес паступова яго жыхароў станавілася ўсё больш і больш лес напоўніўся галасамі маладых звяркоў і птушак.

*Паводле Азізы Ахмедавай*

**83**

**1.** Прачытайце тэкст.

Раніцай Міша з сястрычкай Машай пайшлі ў лес. Яны разышліся ў розныя бакі і пачалі збіраць грыбы.

Маша падышла да елачкі і ўбачыла прыгожы баравік. Яна ахнула ад здзіўлення. Паклікала брата. Але ён не ішоў. Маша паставіла кошык і пайшла да хлопчыка.

А Міша натрапіў на ягады і пачаў іх есці. Калі ён наеўся ягад, Маша павяла брата да елачкі. Але грыба там не было.

Уверсе нешта хруснула. Дзеці ўбачылі вавёрку. Яна сядзела на галінцы і ў лапках трымала баравік.

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Дайце загаловак.

**2.** Падрыхтуйце вусны пераказ папярэдняга тэксту. Складзіце план пераказу пры дапамозе пытанняў (пад кіраўніцтвам настаўніка вусна пастаўце да частак пытанні).



Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Куды пайшлі Маша з Мішам?
2. ...
3. ...
4. ...

Падрыхтуйце вусны пераказ папярэдняга тэксту па плане і апорных словах.

Словы для даведкі: *пайшлі ў лес, пачалі збіраць грыбы; убачыла баравік, ахнула ад здзіўлення, паклікала хлопчыка, пайшла да брата; натрапіў на ягады, пачаў есці, наеліся ягад, павяла да елачкі, грыба не было; нешта хруснула, убачылі вавёрку, сядзела на галінцы, трымала баравік.*

**3.** Перакажыце папярэдні тэкст пісьмова па плане і апорных словах.

**4.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Няма больш баязлівай жывёлы, чым заяц нават пры слабым шуме ён пужаецца і ўцякае толькі познім вечарам або ноччу палахлівы звярок выходзіць са свайго сховішча а днём ён хаваецца многа ворагаў у баязлівага зайчыка.

Дайце тэксту загаловак. Запішыце.

---

**84**

**1.** Прачытайце.

Янка прачнуўся рана. Ён хуценька зрабіў зарадку, памыўся, апрануўся, паснедаў. З добрым настроем хлопчык прыйшоў у школу.

На першым уроку настаўніца расказвала пра горы, пра альпіністаў, пра даследчыкаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Янка ўяўляў сябе падарожнікам, які вандруе па ўсім свеце з фотаапаратам, кінакамерай і запісной кніжкай.

Ідучы дадому, Янка працягваў марыць. А ў вушах гучалі словы настаўніцы: «Хто вельмі захоча, той дасягне сваёй мары».

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Дайце тэксту загаловак.

**2.** Падрыхтуйце вусны пераказ папярэдняга тэксту. Складзіце план пераказу пры дапамозе пытанняў (вусна пад кіраўніцтвам настаўніка пастаўце да частак пытанні).

Словы для даведкі: *прачнуўся рана, зрабіў зарадку, памыўся, апрануўся, паснедаў, з добрым настроем, прыйшоў у школу; на першым уроку, расказвала пра горы, пра альпіністаў, пра даследчыкаў; уяўляў сябе падарожнікам, вандруе па ўсім свеце, з фотаапаратам, кінакамерай, запісной кніжкай; ідучы дадому, працягваў марыць, «Хто вельмі захоча, той дасягне сваёй мары».*

**3.** Перакажыце папярэдні тэкст пісьмова па плане і апорных словах.

**4.** Прачытайце. Вызначце, у якой паслядоўнасці павінны знаходзіцца сказы, каб атрымаўся тэкст.

Рыбакоў знайшлі і аказалі ім дапамогу.
Пачалася завіруха.
Рыбакі лавілі рыбу.
На пошукі іх вылецелі самалёты і верталёты.
Надышла ноч.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Жыццё рыбакоў было ў небяспецы.
Рыбакі вырашылі правесці ноч на крызе.
Крыгу панесла ў адкрытае мора.

Дайце загаловак. Запішыце тэкст.

**85**

**1.** Прачытайце.

Ішла Зіна па лесе. Нечакана дзяўчынка пачула ціхае ціўканне. Пад кусцікам яна ўбачыла птушаня. Гэта быў маленькі, кволенькі шпачок. Ён яшчэ не ўмеў лятаць.

Зіна занесла шпачка дадому. Яна карміла птушку мошкамі, чарвякамі. Восенню шпак ужо добра лётаў, але жыў каля дома і дзяўчынку не забываў.

Аднойчы шпак знік. Зіна здагадалася, што шпак паляцеў у вырай.

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Дайце тэксту загаловак.

**2.** Падрыхтуйце вусны пераказ папярэдняга тэксту. Складзіце план пераказу пры дапамозе пытанняў (вусна пад кіраўніцтвам настаўніка пастаўце да частак пытанні).

Словы для даведкі: *ішла па лесе, нечакана, пачула ціўканне, убачыла пад кусцікам, маленькі, кволенькі шпачок, не ўмеў лятаць; занесла дадому, карміла мошкамі, чарвякамі, восенню, добра лётаў, каля дома, не забываў; аднойчы знік, паляцеў у вырай.*

**3.** Перакажыце папярэдні тэкст пісьмова па плане і апорных словах.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

На суку сядзіць невялікая птушка з яркім апярэннем яе кароткія чырвоныя ножкі моцна ўчапіліся ў кару дрэва галава ў гэтай птушкі амаль з палову тулава нос доўгі, прамы і востры, а хвост кароткі гэта зімародак сустракаецца ён у нас не так ужо часта жывуць зімародкі ля багатых рыбай вадаёмаў з густой раслiннасцю.

*Паводле Віталя Вольскага*

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Дайце загаловак. Запішыце.

**5.** Прачытайце пачатак тэксту.

Прыйшоў неяк дзядзька Валодзя з сенакосу і прынёс яйкі дзікай качкі.

Гаспадыня падклала іх пад кватуху. А праз некалькі дзён у квактухі з’явіліся на свет дзеці.

Новую ферму выпусцілі ў садок. Ох і клопату звалілася на квактуху!

Аднойчы на качанят заглядзеўся кот...

Прыдумайце працяг. Дайце загаловак. Запішыце працяг тэксту. Растлумачце лексічнае значэнне слова *квактуха.*

1. Што такое тэкст?
2. Ці з’яўляюцца тэкстам сказы, у якіх няма агульнай думкі?
3. Што такое тэма?
4. Што такое асноўная думка тэксту?
5. Што такое загаловак?
6. Як могуць злучацца сказы ў тэксце?



Правообладатель Издательский центр БГУ

## СЛОЎНІК

**А** аптэ́ка

**З** зблі́зку
здалёку
зрэ́дку

**І** інтэрв'ю́

**К** кіламе́тр
курасле́п

**Л** ле́тась

**Н** наво́дшыбе
неспадзява́на

**П** падбе́л
паро́ль

**С** сёлета
сон-трава́

**Т** тава́рыш

**У** уве́чары
удзе́нь
уле́тку
уначы́

## АДГАДКІ

Вецер, слова (с. 21)
Зіма (с. 28)
Дзень, лён, месяц, снег (с. 45)
Дзьмухавец (с. 46)
Грак, ручаёк (с. 49)
Сабака (с. 82)
Хмара, ноч (с. 95)
Трактар, вецер,
бярозка (с. 103)
Хлеб (с. 122)



Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗМЕСТ

ДЗЕЯСЛОЎ .......... 4
Неазначальная форма дзеяслова .......... 12
Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу .......... 19
*1-е, 2-е спражэнне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу* .......... 25
Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў 1-га, 2-га спражэння .......... 39
Змяненне дзеясловаў прошлага часу .......... 52

ПРЫСЛОЎЕ .......... 66

СКАЗ .......... 84
Аднародныя члены сказа .......... 92

ТЭКСТ .......... 105
Тыпы тэкстаў .......... 109
*Тэкст-апавяданне* .......... 110
*Тэкст-апісанне* .......... 112
*Тэкст-разважанне* .......... 118
*Тэкст-дыялог* .......... 120
*Тэкст-маналог* .......... 122

Слоўнік .......... 133
Адгадкі .......... 133

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

Вучэбнае выданне

**Альфер** Маргарыта Віктараўна
**Сафонава** Ала Пятроўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 5 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

Галоўны рэдактар *В. С. Пайколас*
Рэдактар *Н. Б. Кучмель*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Тэхнічнае рэдагаванне *К. У. Раманчык*
Камп'ютарная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Т. М. Булатава, В. М. Іваноў*
Мастакі *Л. А. Мурашка, Н. У. Сустава*

Падпісана ў друк 16.04.2013. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,5. Тыраж 930 экз. Заказ 70.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Издательский центр БГУ